# АДАМ ГЛЁБУС

## POST SCRIPTUM



# КАНТАМІНАЦЫІ

Vostraja Brama
НАША НІВА
1999

**Vostraja Brama**
**1999**

# АДАМ ГЛЁБУС

## POST SCRIPTUM

Кантамінацыі

Vostraja Brama
НАША НІВА
1999

ISBN 985-456-421-5

**Адам Глёбус (Адамчык Уладзімер). POST SCRIPTUM.** Кантамінацыі. — «Наша Ніва» (Бібліятэка «Вострая Брама», 0). — 1999. — 176 с.

У сваёй адзінаццатай кнізе аўтар сабраў афарызмы, цытаты з камэнтарам, грэгеры і максымы. Зборнік кантамінацыяў — плён дзесяцігадовае працы.

Рэдактары Ўладзімер Арлоў і Сяргей Дубавец
Мастакі Ўладзімер Адамчык і Іна Каюта
Карэктар Аляксандра Макавік
Макет Ігара Махнача

© Адам Глёбус, 1999
© Уладзімер Адамчык, Іна Каюта, 1999
© «Наша Ніва», 1999
© «Сучасны літаратар», 1999

# I. ЖЭСТ – GESTURE

*Пра творчасьць*

## 1. Культура

∘ ∘ ∘

Культура — па-першае, культывацыя зямлі, па-другое, культ асобы, а потым — усё астатняе.

∘ ∘ ∘

Найпершая задача камэрцыйнай культуры — растыражаваць каштоўнае й прадаць яго як мага таньней.

∘ ∘ ∘

Калі чытаю, слухаю або гляджу выдатны твор, на нейкі момант адчуваю жаданьне, каб ён належаў толькі мне. Вось так і ўзьнікаюць таемныя калекцыі і бібліятэкі.

∘ ∘ ∘

Культура — гэта веданьне дакладнай адлегласьці, на якой мусіш вітацца з ворагам.

## 2. Творчасьць

∘ ∘ ∘

Шліфоўка, удасканальваньне, аздабленьне формы пры кволай ідэі выглядае непатрэбшчынаю.

∘ ∘ ∘

Прыгажосьць мае крышку мінорнае адценьне.

∘ ∘ ∘

Пакуты творцаў зазвычай беспадстаўныя: мастаку здаецца, што рэальныя карціны горшыя за ўяўныя, а літаратар перакананы, што яшчэ не напісаў вартага твору.

∘ ∘ ∘

Пазьбягай дачыненьняў зь людзьмі нікчэмнымі... Асабліва небясьпечны тут — тэлефон, бо чужы голас адразу трапляе ў сьвядомасьць. У пакоі, дзе стаіць тэлефонны апарат, немагчыма засяродзіцца, немагчыма займацца творчасьцю.

## 3. Талент

∘ ∘ ∘

У найбяздарнейшага рамесьніка ёсьць прынамсі адзін прыхільнік. Звычайна на гэтую ролю пагаджаецца жонка.

∘ ∘ ∘

Талент літаратара, як і любы іншы талент, табе дорыць прырода. Асноўная праблема таленавітага чалавека ў тым, каб наяўнасьць таленту яму даравалі людзі.

∘ ∘ ∘

Геній стаіць вышэй за ўсялякія канстытуцыі, праграмы й законы, таму дзяржава помсьціць генію жорстка й злосна. Калі ўмее — у рамках законаў і канстытуцыяў, а нярэдка й выходзячы за іх.

∘ ∘ ∘

Большасьць людзей нараджаюцца й застаюцца ў жыцьці пасрэднымі, таму старанны, паслухмяны, пасрэдны працаўнік хутчэй знаходзіць прызнаньне ў народзе, чым асоба геніяльная. Каб зразумець генія,

трэба самому нарадзіцца хоць бы таленавітым.

∘ ∘ ∘

Большасьць разумных людзей, жывучы ў сталіцах, існуюць і працуюць ў правінцыях. Для адных гэтая правінцыя завецца навукаю. Для другіх — рэлігіяй... Як і кожны, спадзяюся, што зь цягам часу на сьвеце будзе больш творцаў, якія пажадаюць жыць у сталіцы, дзе ўраўнаважана скампануюцца і навука, і мастацтва, і рэлігія, і эротыка. Дзе адзін правінцыйны талент ня будзе імкнуцца прынізіць другі талент толькі за тое, што ён зь іншай правінцыі, зь іншага рэгіёну ці сэктару.

∘ ∘ ∘

Дзяржава прыўлашчвае заслугі генія, якога пасьлядоўна, пэдантычна, скрупулёзна зьневажала.

∘ ∘ ∘

Улада — гэта яшчэ й захоп чужых здольнасьцяў і ведаў.

∘ ∘ ∘

Не наракай на фартуну. Лёс прапануе шмат магчымасьцяў і людзям бяздарным,

яны проста не заўважаюць і не скарыстоўваюць іх. Злавіць шчасьце можна толькі таленавітай рукою.

◦ ◦ ◦

Ленавацца ня менш складана, чым працаваць. Працуеш па агульнапрынятых правілах і адпачываеш па правілах, а лянуесься — па сваіх жаданьнях. Таленавітых лайдакоў гэтаксама мала, як і здольных працаўнікоў. Пра гэта сьведчыць і колькасьць баек, казак, раманаў, песень пра людзей лянівых.

◦ ◦ ◦

Геніяльнае не падробіш... Сказаў Вавэнарг. Так. Ніхто й не спрабуе падрабляць геніяльнае. Падрабляюць творы, падрабляюць прадукцыю геніяльных працэсаў, а яна хоць і адбівае ў сабе, як люстэрка, постаць генія, сама, па сутнасьці, геніяльнай рэччу не зьяўляецца.

◦ ◦ ◦

Галоўнае ў творчасьці — наладжваньне працэсу, а не канчатковы прадукт.

∘ ∘ ∘

Калі табе перасталі зайздросьціць, значыць, ты згубіў талент.

∘ ∘ ∘

Фальшывыя манэты ходзяць з-за недахопу сапраўдных грошай у таленавітых людзей.

∘ ∘ ∘

У пасрэдных людзей ёсьць патаемны пароль: прэч заслугі. І калі ты хоць на крок выйдзеш наперад, дык адразу пачуеш за сьпінаю абра́зы й зьнявагі, якія выканае хор пасрэднасьцяў.

∘ ∘ ∘

Ад кожнага — па здольнасьцях, кожнаму — па запатрабаваньнях. Існуе й такая схема пабудовы грамадзтва. Але чым большыя здольнасьці, тым меншыя запатрабаваньні, і наадварот.

∘ ∘ ∘

Дзень — маленькае люстэрка, у якім адбіваецца ўсё жыцьцё. У геніяльнага чалавека не бывае бяздарных дзён. Ёсьць у яго сумныя

хвіліны, вясёлыя імгненьні, трагічныя тыдні, а бяздарных дзён няма. Таму дастаткова чалавеку таленавітаму апісаць адну сустрэчу з геніем, каб ты зразумеў і ўбачыў веліч выбітнай асобы.

## 4. Слава

○ ○ ○

Той, хто імкнуўся да вядомасьці, багацьця й славы, а ў выніку не займеў іх, ніколі ня выкліча спачуваньня. Наадварот, з такіх няздараў зьдзекуюцца й насьміхаюцца найбольш.

○ ○ ○

Пра добры твор гаворыць нямнога людзей, але — доўга.

○ ○ ○

Нячаста, але сустракаюцца асобы, настолькі самадастатковыя, што іх не цікавіць прызнаньне й слава, ім не патрэбныя ацэнкі й адзнакі іншых, іх не абыходзяць чужыя меркаваньні пра ўласныя паводзіны. Хацеў бы я быць такім, незалежным ва ўсім. А ў мяне атрымліваецца толькі ў камэрнай творчасьці.

○ ○ ○

Каб цябе пачулі і слухалі, гавары тое, што людзі прагнуць пачуць.

° ° °

Вядомасьць дасягаецца толькі праз кепскую рэпутацыю.

° ° °

Вышыня сёньняшняга трыюмфу сьведчыць пра глыбіню заўтрашняга падзеньня.

° ° °

Папулярнасьць — гэта перш-наперш пасрэднасьць, а пасрэднасьць — гэта ўчарашняя вядомасьць.

° ° °

Мода — найвялікшы вораг папулярнасьці, бо мода зьмяняецца з кожным сэзонам.

° ° °

Апранахі блазнаў і каралёў аднолькава зіхаткія. Зусім не прынцыпова тое, што ў аднаго золата сапраўднае, а ў другога — штучнае, бо словы каралёў і блазнаў здатныя выклікаць адно ўсьмешку.

∘ ∘ ∘

Няўжо слава прыйдзе тады, калі ты канчаткова страціш гонар?

∘ ∘ ∘

Слава кампануе свае каляжы такім чынам, што ў адзін тэлевізійны кампот трапляюць зусім розныя асобы: генэралы й шарлятаны, міністры й фігляры, мільянэры й сьпевакі. Табе застаецца толькі выкінуць злучнік, замяніўшы яго на дэфіс, і зрабіць выснову. Генэрал-шарлятан, міністар-фігляр, сьпявак-мільянэр — вось яны, абраньнікі народнай славы. Мае рацыю Шапэнгаўэр, калі піша... Слава сярод сучасьнікаў нячаста ператвараецца ў трывалую пасьмяротную славу.

## 5. Літаратура

° ° °

Эгаістычны літаратар мусіць адмаўляцца ад рамяства, бо ягоная патрэба — падабацца сабе, а не суцяшаць і забаўляць іншых, чужых, натоўп, як гэта робяць прафэсійныя бэлетрысты.

° ° °

Пісьменьнік-лісьлівец-прафэсіянал выдатна ведае, што ніводны з тыранаў не адмовіўся ад сваіх літаратурных партрэтаў, аўтабіяграфіяў і хвалебных гімнаў. З гэтага прафэсіянал і жывіцца.

° ° °

Літаратура будуецца яшчэ й на страху, што незанатаваныя думкі зьнікнуць.

° ° °

Экстрэмальны літаратурны твор — кароткая, блытаная перадсьмяротная запіска.

° ° °

Шмат каму зь літаратараў асноваю для ацэнкі напісанага служаць: па-першае, колькасьць выкладзеных на паперы знакаў, што прыроўніваюцца да грашовых адзінак; па-другое, колькасьць асобнікаў надрукаванай кнігі, што істотна ўплывае на заробак. Асуджаць і папракаць за такі падыход да літаратурнае працы нельга. Наадварот, такія паводзіны літаратара трэба хваліць на кожным скрыжаваньні. Толькі мне да душы іншыя крытэры... Люблю наяўнасьць у тэксьце нечаканых і парадаксальных думак і развагаў, шаную ляпідарнасьць і нешматслоўнасьць, паважаю някідкую прыхаваную сувязь з творамі вялікіх папярэднікаў і радуюся амаральнасьці аўтара, амаральнасьці з пункту гледжаньня масавай сьвядомасьці.

° ° °

Чытача можна падмануць толькі адзін раз, а потым даводзіцца мяняць псэўданім.

° ° °

Нечаканая канцоўка навэлы заўсёды ілжывая.

ο ο ο

Калі табе кажуць: «А я ведаю, пра што будзе тваё наступнае апавяданьне...», ты абавязкова дапытайся пра здагадкі й вэрсіі, каб не напісаць чужога.

ο ο ο

Вавэнарг сьцьвярджаў, што людзі разумныя ня пішуць і не чытаюць раманаў, бо дастаткова чалавеку адчуць, што ўяўная веліч хавае за небыліцамі звычайную хлусьню, як яго ахоплівае гідлівасьць, таму раманы й не перачытваюцца. Выдатнае назіраньне. Толькі мне не давялося сустрэць ніводнага разумнага, які б не прачытаў пару-тройку бульварных раманаў. Усе не без грахоў. Мяркую, спадар Люк дэ Клап'е дэ Вавэнарг таксама пачытваў раманы. Таму й скажу наступнае... Разумны чалавек адмаўляецца чытаць раманы.

ο ο ο

Нішто так хутка не псуе рэпутацыю літаратара, як праўдзівыя выказваньні пра суайчыньнікаў і супляменьнікаў.

ο ο ο

Лепей не спрачацца пра якасьці мясьцінаў, у якіх ня быў, і пра вартасьці звычаяў,

якіх ня бачыў. Кожны з нас і так шмат дзе пабываў і многае паглядзеў, каб цікава расказаць.

○ ○ ○

Ня варта чакаць удзячнасьці за пахвальбу. Ведаючы пра гэта, крытыкуй, іранізуй, кажы праўду і галоўнае — ня бойся, што ў адказ атрымаеш жорсткія словы, а тым больш дзеяньні.

○ ○ ○

Кожная думка новая, — заўважыў Вавэнарг, — калі чалавек выказвае яе на свой лад... Удакладню: на сваёй мове і ў новай маладой краіне...

○ ○ ○

У адным слове ісьціны ня менш, чым у разгорнутым сказе. Але большасьць літаратараў усё адно імкнуцца акрэсьліваць ісьціну менавіта сказамі, а ня словамі.

○ ○ ○

Афарызм — арыстакратычная форма.

○ ○ ○

Пішучы ў газэту, ні на імгненьне не забывай, што рэфарматарам, патрыётам, рэвалюцыянэрам салодка жывецца толькі на старонках гістарычных энцыкляпэдыяў.

○ ○ ○

Трэба быць поўным ідыётам, каб пісаць ня дзеля заробку. І дзевяноста дзевяць літаратараў з кожнае сотні паслухмяна графаманяць дзеля грошыкаў. А табе, каб паважаць сябе, варта заставацца круглым пісьменьнікам і паціху занатоўваць сякія-такія думкі дзеля сяброў і ўласнага задавальненьня. Заставайся адным з сотні.

○ ○ ○

Літаратура — працэс маральнага рэфармаваньня.

○ ○ ○

Надыходзяць і такія часы, калі нават звычайнаму літаратару нічога не застаецца, як пісаць таемны дзёньнік.

○ ○ ○

Паэту цяжка сказаць нешта такое, што да яго не гаварылі, таму і стварае паэт новую мову.

∘ ∘ ∘

Грэгерыі — жарты, якія робяць выгляд, што яны афарызмы.

∘ ∘ ∘

Пісаць — азначае перакладаць уласныя ўражаньні на агульнавядомую мову, а чытаць — азначае вяртаць з агульнага ў асабістае.

∘ ∘ ∘

Афарызм — ангельскі жарт, вымаўлены з французскім акцэнтам і нямецкай стараннасьцю.

∘ ∘ ∘

Цяжка ўявіць, што адбылося б з чалавекам, каб ён жыў у дзяржаве, населенай літаратурнымі героямі... Піша Джозэф Адысон. Але... Кожны пісьменьнік шмат часу бавіць менавіта ў такіх дзяржавах і не шкадуе, бо літаратурныя імпэрыі лепшыя за рэальныя, іх можна пакінуць у адно імгненьне.

∘ ∘ ∘

Раман — жанар хлусьлівы, калі ён апісвае страсьці дзеля іх саміх, не адшукваючы пры

гэтым ніякіх карысных, з пункту гледжаньня маралі, высноваў. Няма нічога больш простага, чым апісваць страсьці. Для гэтага дастаткова нарадзіцца крышку шакалам, крышку грыфонам і крышку пантэраю... Так пісаў у сваім «Вершы І» Лятрэамон. Ня ведаю, як калегам, а мне гэтая развага даспадобы. Бульварнае чытво пішацца людзьмі драпежнымі, хцівымі, тымі, хто мае сэрца шакала. Я гэта ведаю.

∘ ∘ ∘

Паэзія, якая абмяркоўвае неабходныя ісьціны, не такая чароўная, як паэзія, што іх не абмяркоўвае... Заўважыў Лятрэамон. Бясспрэчна, лірыка складае сутнасьць паэзіі. Верш пра зьменлівую прыроду, пра жабку, што скочыла ў стары стаў, спалохаўшыся крокаў паэта, мне бліжэй, чым рэвалюцыйны пошчак барабанных радкоў. Паэзія, як жывапіс і музыка, ня ведае, што такое ДОБРА й КЕПСКА, яна знаходзіцца ў той частцы сьвядомасьці, дзе яшчэ не існуе падзелу на дабро й зло. Найлепшыя мастакі, паэты, музыкі — дзеці. Магу паўтарыць гэтую сэнтэнцыю тройчы, ведаючы яе двухсэнсоўнасьць.

∘ ∘ ∘

Кніжныя прылаўкі асьляпляюць чароўнасьцю безьлічы гнюсных раманаў. Ба-

чыць Бог, здаецца часам, што лепей забіць кнігу і ўратаваць чалавека, які губіць сябе за 100 су... Больш за стагодзьдзе мінула ад назіраньня, зробленага Лятрэамонам, а кнігарні дагэтуль асьляпляюць пакупнікоў бліскучымі вокладкамі гнюсных раманаў. Так і не знайшлося ў сьвеце Давіда, які здатны забіць кніжнага Галіяфа. Гнюсны чытач мусіць мець свой гнюсны раман, накрапаны гнюсным бэлетрыстам. Нашто так перажываць? Калі я думаю пра кнігу, дык не пра раман, а пра танюткі просты дадатак да тоўстага дзяржаўнага падручніка, які можа дапамагчы звычайнаму вучню ў двубоі з настаўнікам.

∘ ∘ ∘

Лепей адразу запісаць сваё меркаваньне, чым прылюдна яго выказаць. Спакайней жыць літаратарам, чым дасьціпнікам. Вядома, цяжка стрымлівацца, бо думка нараджаецца ў роце, а не на дзюбцы алоўка.

∘ ∘ ∘

Ёсьць літаратары, якія сьвядома вярэдзяць свае найчарнейшыя ўспаміны, занатоўваюць гідкія сны ды брыдотныя фантазіі. Героі такой творчасьці атрымліваюцца найбліжэйшыя да народу. Ты можаш асудзіць творы падобнага кшталту, а можаш іх выка-

рыстаць — апрацаваць, як апрацоўваецца фальклёр.

∘ ∘ ∘

Не сьпяшайся зь перакладам уласных твораў на іншыя мовы, бо гэта ня йдзе на карысьць тваёй сям'і, тваёй дзяржаве й тваёй нацыі. Неперакладзенае, ненадрукаванае, нявыказанае — трымае ў жыцьці.

∘ ∘ ∘

Лепшае пішы на пяску.

## 6. Слова

∘ ∘ ∘

Жывёла гаворыць выключна на роднай мове.

∘ ∘ ∘

Подпісы пад здымкамі, як і надпісы на фотаздымках, могуць ня толькі графічна, але й сутнасна зьмяніць фотавыяву. Напішы на твары чалавека слова «раб» ці «кароль», накрэмзай выразную характарыстыку пэрсанажа й пабачыш зьмену.

∘ ∘ ∘

Злы гаворыць трапна.

## 7. Кніга

◦ ◦ ◦

Кожная кніга, выпраўляючыся ў сьвет, рызыкуе сутыкнуцца зь неразуменьнем і непрыманьнем. Яна, як карабель, плыве ў чужы сьвет, акрыленая спадзяваньнем на зычлівую й сяброўскую сустрэчу. Але, робячы кніжкі, узбройвай іх усімі вядомымі табе сродкамі, бо ворагаў заўсёды болей, чым сяброў.

◦ ◦ ◦

Загнаная ў кут жывёла можа зрэагаваць рэфлексам падманнай сьмерці. Падобнае адбываецца зь літаратарам у таталітарнай краіне. Ён зьнішчае сваё прозьвішча, кнігі выходзяць ананімна. І як пад час падманнай сьмерці жывёла знаходзіцца ў экстрэмальнай напружанасьці, так і ананімны твор канцэнтруе ў сабе максымум інтэлектуальнага супрацiву.

◦ ◦ ◦

Грэшнікі, забойцы, тыраны знаходзяць месца ў памяці чалавецтва значна лягчэй за паслухмяных, сьціплых і сьвятых людзей. Зазірні ў падручнік гісторыі.

∘ ∘ ∘

Наколькі штодзённая газэта дыялектычная, настолькі кніга мэтафізычная.

∘ ∘ ∘

Добрыя кнігі робяцца з кніг, а кепскія — з газэтаў, з часопісаў, з тэлевізіі й інтэрнэту.

∘ ∘ ∘

Самыя супярэчлівыя кнігі — зборнікі афарызмаў.

∘ ∘ ∘

Людзі непасрэдныя могуць быць разважлівымі ў меру сваёй здатнасьці, і аўтары невялікіх кніжак — таксама. Гаварыў Вавэнарг, пэўна, працягваючы думку Эклезіяста. Не складай шмат кніжак. А таму, запісваючы й складаючы развагі ў кніжку, кампанаваць твор варта як мага шчыльней.

∘ ∘ ∘

Энцыкляпэдыі — могільнікі інфармацыі. Чытаеш і спатыкаесься аб даты сьмерцяў і нараджэньняў.

∘ ∘ ∘

У букіністычных крамах гуртуюцца недачытаныя кнігі.

∘ ∘ ∘

Як чалавек нараджае чалавека, як дрэва спараджае дрэва, так і з кнігі выходзіць кніга.

∘ ∘ ∘

Ёсьць два стаўленьні да кнігі: прачытаў і перадаў другому, прачытаў і выкінуў. Мне падабаецца трэці варыянт: прачытаў і перачытаў.

∘ ∘ ∘

Зазвычай пісьменьнік і чытач залічваюцца ў асноўныя творцы кнігі. Калі зірнуць крышку шырэй, дык у сутворцы трапяць і мастакі, і рэдактары, і друкары, і гандляры, а яшчэ — чытачовы знаёмыя, вучні й сябры, усе, з кім будзе падзеленая думка наконт прачытанага. Калі ж рассунуць часавыя парамэтры, дык вакол кнігі ўзьнікнуць постаці крытыкаў і перакладчыкаў, а за імі, сярод натоўпу спажыўцоў, можна разгледзець і чытача-літаратара. Таго, хто ня толькі прачытае тэкст і выкажацца наконт ягоных вартасьцяў, але і выбера найлепшае й перапіша

наноў дзеля наступніка. Таму не памылюся, назваўшы асноўным творцам кнігі чытача-літаратара, які здатны надрукаваць і распаўсюдзіць уласны твор дзеля вядомых і невядомых сяброў.

∘ ∘ ∘

Паміж чытачом і кнігаю заўсёды ўплішчваюцца гандляры з калекцыянэрамі.

∘ ∘ ∘

Энцыкляпэдыя і газэта — дзьве скрайнасьці. Але, калі ўважліва паглядзець, заўважаеш: энцыкляпэдыя на дзевяноста адсоткаў складзеная са старой газэтнай інфармацыі, а ў газэце дзевяноста адсоткаў інфармацыі ўзятыя з энцыкляпэдыі і прададзеныя за навіны.

∘ ∘ ∘

Кнігу перачытваюць, газэту праглядаюць.

∘ ∘ ∘

Пісьменьнік — толькі той, хто любую кніжку ператворыць у запісную.

◦ ◦ ◦

Мінулае заўсёды бруднае, як дэтэктыўны раман, а будучыня збольшага падманная, як фантастычная аповесьць.

◦ ◦ ◦

Існуюць кнігі як формы раскошы. Сталеючы, я ўсё больш аддаю перавагу такім выданьням.

◦ ◦ ◦

У словазлучэньні «збор твораў» чуюцца два першыя ўдары пахавальнага звону.

◦ ◦ ◦

Зборнік паэта, які складае вершы безь любові, трыкроць лепшы за кніжку імітатара любові, але яшчэ горш выглядае брашурка з эсэістыкай, дзе прафануюцца веды й густ.

◦ ◦ ◦

Зьбіраесься пачытаць і заўважаеш: бярэш ня самую разумную кнігу, пераглядаеш ня лепшыя старонкі, наогул, жывеш няправільна.

○ ○ ○

Ёсьць кнігі, якія ня трэба вяртаць, нават калі табе давялося доўга выпрошваць і абяцаць, што заўтра абавязкова вернеш. Па такія кнігі гаспадар сам мусіць прыйсьці, чым і давядзе, што яму кніга патрэбная больш.

○ ○ ○

Можаш уласны досьвед параўнаць са зьместам кнігі, а зробленыя высновы — з камэнтаром. Можаш рабіць і наадварот: зьместоўныя кнігі залічваць ва ўласны досьвед.

○ ○ ○

Тэлефонны даведнік — пранумараваная безабароннасьць.

## 8. Мастацтва

◦ ◦ ◦

Ці бывае на фотаздымках будучыня? Рыторыка. Але ж вочы сфатаграфаваных істотаў углядаюцца менавіта ў будучыню.

◦ ◦ ◦

Вельмі часта ты ходзіш на могілкі з адной мэтаю — паразглядаць фотапартрэты.

◦ ◦ ◦

Фота — доўгі, сапраўдны, незавершаны час.

◦ ◦ ◦

Самае выбуховае, экспрэсіўнае, дынамічнае фота ўсё адно мэлянхалічнае.

◦ ◦ ◦

Найгоршая памылка чалавецтва ў дачыненьні да фотавыявы — выкарыстаньне апошняй як доказу рэальнасьці той ці іншай падзеі. А ці існавала пачвара Нэсі ў

Лахнэскім возеры? Не. Але ж фотакартку земнаводнага з маленечкай галавою й доўгай шыяю бачылі ці ня ўсе. Фота — ускосная ўліка, як і галасы на магнітафонных стужках, як малюнкі, як паказаньні сьведак, як група крыві.

○ ○ ○

Тэлевізію й кіно глядзяць, а фота бачаць і разглядаюць.

○ ○ ○

Фотакарткі сьмяротныя, як і ўсё на сьвеце. Зрэшты, чаго можна патрабаваць ад адлюстраваньня? Ведаю адзін жорсткі варыянт: прыходзіць Чорны чалавек, ірве здымкі і б'е люстэрка.

○ ○ ○

На думку Вавэнарга, філязофія ня менш падуладная модзе, чымся вопратка й музыка, архітэктура дый іншае. Вока чапляецца за слова «архітэктура», і ўзьнікае жаданьне крышку падрэдагаваць дэфініцыю... Філязофія, як і архітэктура, падпарадкоўваецца стылю.

○ ○ ○

Малюючы дакладны аўтапартрэт, можна стварыць вобраз, непадобны да сябе.

○ ○ ○

Творчасьць — барацьба з самагубствам.

○ ○ ○

Танцы — вельмі эратычны занятак. Танцы — прэлюдыя полавага акту. Танцы — рэпэтыцыя блізкасьці.

○ ○ ○

Танец — найлепшы зводнік.

○ ○ ○

«Самае пікантнае для эратычнай юрлівай фантазіі, — лічыць нямецкі мараліст Эдуард Фукс, разважаючы пра канкан, — гэта калі жанчына са слодычным захапленьнем дэкальтуецца на вачах у свайго партнэра зьверху й данізу, калі яна ў парыве шаленства цалкам агаляецца перад ім, нібыта кажучы пра сваю адданасьць бессаромнымі жэстамі, якія больш ясныя за ўсе словы...»

Танец, як кампазыцыя жэстаў, зьявіўся значна раней за слова. Таму ён больш пры-

родны, раскрыты, аголены. Спачатку быў жэст, потым быў танец, потым было слова, і слова было Бог.

Чалавек гаворыць ня толькі словамі.

Чалавечае цела можа гаварыць жэстамі, бо яны дамінуюць у полавым дыялёгу. І пацьвердзіць тое можа факт з гісторыі канкану.

◦ ◦ ◦

У кіно ёсьць вялікая перавага над шмат якімі відамі мастацтва: у цёмнай залі вельмі цяжка ўбачыць чырвоныя ад сораму вушы. Ня ведаю, як ты, а я даволі часта чырванеў за бессаромныя ўчынкі экранных герояў. І саромеўся не аголенасьці ды эротыкі, хоць было й такое, а падманаў і хлусьні, сьведкам якіх апынуўся не з уласнае волі.

◦ ◦ ◦

Здатнасьць мастака да пераўвасабленьняў і вызначае працягласьць творчага жыцьця.

◦ ◦ ◦

Выбухі, пажары, руйнаваньне — знаходкі для кінавытворцаў.

○ ○ ○

Някепска глядзяцца на экране пахаваньні, хаўтуры і іншыя ўрачыстасьці, асабліва калі яны з часам страчваюць ідэалягічную афарбоўку.

○ ○ ○

Непрыстойныя жэсты выглядаюць на кінаэкране занадта тэатральна, але трапляюць у лік набыткаў праз сваю прыродную яскравасьць ды эратычнасьць.

○ ○ ○

Вельмі кепска глядзяцца на экране інваліды, бо ўвесь час узьнікае сумнеў: а ці сапраўды ён сьляпы, а ці сапраўды ў яго няма нагі, а можа ён яе ўдала схаваў, каб нас падмануць?

○ ○ ○

Фота вынайшлі не мастакі й не навукоўцы, а альхімікі. Фотаздымак — дзьвюхмерная праекцыя філязофскага каменю.

○ ○ ○

Ні адзін па-сапраўднаму выбітны чалавек ніколі не забіваў часу на складаньне

баек... Сказаў Вавэнарг, забыўшыся пра Эзопа.

° ° °

Найбольш карысныя тыя парады, якімі лёгка кіравацца... Думка Вавэнарга перагукаецца з выказваньнем Скаварады... Цяжкае, яно й непатрэбнае.

# II. НУЛЬ — ZERO

*Пра навуку*

## 1. Розум

∘ ∘ ∘

Розум прымушае нас верыць у тое, у што мы ня можам паверыць з-за абмежаванасьці нашых пачуцьцяў. У бясконцасьць сьвету, напрыклад.

∘ ∘ ∘

Калі гаворыш разумнае, цябе амаль ня чуюць. Чым болей прамаўляеш значных рэчаў, тым меней маеш уважлівых слухачоў. У глупства найвялікшыя шанцы займець слухачоў і авалодаць аўдыторыяй. Паспрабуй на людзях забрахаць па-сабачы і пераканаесься.

∘ ∘ ∘

Праўды не саромеецца вар'ят.

∘ ∘ ∘

Паміж поўным ідыётам і вельмі разумным чалавекам менш розьніцы, чымся паміж мёртвым і жывым.

ο ο ο

Зьдзіўляе адназначнае імкненьне чалавека наблізіцца, каб зразумець; хоць у большасьці выпадкаў трэба, наадварот, зрабіць крок назад.

ο ο ο

Калі ты разумны, цябе досыць проста папракнуць за бессардэчнасьць і маладухоўнасьць.

ο ο ο

Розум — гэта ўменьне выходзіць з дурных акалічнасьцяў.

ο ο ο

Калі з табою пагадзіліся, гэта не азначае наяўнасьці разумнага паплечніка.

ο ο ο

Разумнага немагчыма пакрыўдзіць; крыўдуеш роўна настолькі, наколькі пачуцьці пераўзыходзяць розум.

ο ο ο

Незаўсёды можаш сабе дазволіць раскошу — быць разумным.

○ ○ ○

На думку Плятона, Дыяген — гэта звар'яцелы Сакрат. Удакладню... Дыяген — Сакрат, які не гаворыць, а брэша. Зрэшты, галоўнае, што Дыяген зьяўляецца Сакратам, а якім — справа другая.

○ ○ ○

Сіла розуму, відавочна, большая ў тых, хто яе ўсьведамляе, чым у тых, хто пра яе ня ведае... Так напісаў Лятрэамон.

Пагадзіцца з такой тэзаю лёгка. Паводле маіх перакананьняў, чалавек таму й жыве на сьвеце даўжэй за астатніх, бо разумнейшы. І вынаходніцтва Бога, і трактоўка Бога як разумнай субстанцыі, і бесьсьмяротнасьць душы паводле Плятона — усё гэта досыць роўна кладзецца ў пераканаўчы рад папярэдняй тэзы. Але мне хацелася намаляваць адзін эпізод з уласнага жыцьця, каб яшчэ раз засьведчыць дакладнасьць думкі Лятрэамона.

Раніцай, з стрыечным братам Анатолем, мы йшлі на заняткі, я — у вучэльню, а ён — у інстытут. Замест прабежак мы рабілі праходкі. Хуткімі крокамі праходзілі восем тралейбусных прыпынкаў. І вось за адну раніцу мы пабачылі дзесяць раздушаных на дарозе катоў. Тыдзень не было апэтыту. І ўсё жыцьцё мяне перасьледуе думка пра не-

разумнасьць і жорсткасьць прыроды, пра яе сьляпую самаахвярнасьць. Таму ўсе ваенныя канфлікты я адношу да стыхійных бедзтваў і ненавіджу выраз «ваеннае мастацтва». Уласна розум ня можа быць скіраваны на вайну, розум скіроўваецца ў супрацьлеглы бок, на пазьбяганьне вайны. Кіравацца ў ваеннае пекла можа толькі псыхічна хворы, маньяк, цалкам неразумны чалавек. І таму ў сыстэме агульнай адукацыі неабходна аддаваць перавагу ў вывучэньні спадчыны людзей разумных, якія ўсьведамлялі й ведалі сілу свайго таленту й розуму, а гісторыю пра дзеяньні маньякаў, гвалтаўнікоў, тыранаў неабходна калі ня цалкам скасаваць, дык значна падкараціць і перанесьці ў лекарскія падручнікі пра псыхічныя расстройствы й адхіленьні.

∘ ∘ ∘

Калі Франсуа дэ Лярашфуко разважае пра пашырэньне розуму да межаў магчымага, міжвольна ўзьнікаюць думкі пра вар'яцтва.

∘ ∘ ∘

Калі не стае ведаў, каб размаўляць і падтрымліваць разумныя адносіны, тады зьвяртаюцца па дапамогу да сьпіртнога, тытуню, кавы й гарбаты.

∘ ∘ ∘

Любоў — зьява суб'ектыўная, цьмяная, жаноцкая й сьляпая, а вось павага — аб'ектыўная, мужчынская рэч, яна асьветленая тваімі развагамі й розумам.

∘ ∘ ∘

Як вока бачыць зьнешняе сьвятло, а вуха чуе навакольныя гукі, так розум рэагуе на сьвет духоўны.

∘ ∘ ∘

Разумных, а тым больш духоўных, зусім мала.

∘ ∘ ∘

Агрэсіўнасьць ідзе ад неразумнасьці. Але не кажы, што ад розуму паходзяць падман і хітрасьць, бо яны вынікаюць гэтакса-ма зь неразумнасьці. Разумнасьць — гэта спакой.

## 2. Цывілізацыі

∘ ∘ ∘

Гісторыя — гэта ня толькі біяграфіі вялікіх асобаў, але і біяграфіі вялікіх стыляў, культураў, цывілізацыяў.

## 3. Прырода

∘ ∘ ∘

У прыгажосьці кветкі ты можаш заўважыць і ўласную непараўнальнасьць.

∘ ∘ ∘

Калі вымаўляю «прырода», уяўляецца краявід з высокімі зялёнымі дрэвамі.

## 4. Чалавек

∘ ∘ ∘

Ад адной толькі думкі пра мясакамбінат можна моцна пачырванець за тое, што ты — чалавек.

∘ ∘ ∘

Працягласьць жыцьця шмат у чым залежыць ад інтэлекту. Вар'яты доўга не жывуць. Дурні хутка старэюць.

∘ ∘ ∘

Каб звацца чалавекам, трэба няшмат: дастаткова навучыцца адрозьніваць велічнае ад мізэрнага.

∘ ∘ ∘

Усе ведаюць... Чалавек шчасьлівы толькі на сваім месцы. А хто падкажа, як знайсьці і — галоўнае — займець запаветнае месца?

∘ ∘ ∘

Чужога болю, пра які разважаюць падманшчыкі ад дабрачыннасьці, у прыродзе не існуе.

∘ ∘ ∘

У чалавека толькі тры сапраўдныя ворагі: вар'яцтва, бяссоньне і голад.

∘ ∘ ∘

Чалавек малюе адно сябе, таму тыгры атрымліваюцца маленькія, а мурашы — вялікія.

∘ ∘ ∘

Мазахістаў болей, чым садыстаў, доказ гэтаму — вынікі дэмакратычных выбараў: дыктатараў абіраюць сьвядома.

∘ ∘ ∘

Чалавек — істота неразумная... Чым даўжэй жывеш, тым болей пераконваесься ў падобных банальнасьцях.

∘ ∘ ∘

Малы чалавек сумуе па сваёй зямлі... Прачытаўшы такое, нельга ня ўбачыць у сабе «малога чалавека».

∘ ∘ ∘

Складаньне пэрспэктыўных плянаў, як і любоў да пісаньня ўспамінаў — занятак чалавечы.

∘ ∘ ∘

У кожнага чалавека ёсьць свая цана, але існуюць людзі бясцэнныя — геніі й жабракі.

∘ ∘ ∘

Задумвацца, вось што цяжка. Знойдзецца няшмат людзей, здатных на такую, здаецца, просьценькую справу. Значна лягчэй услухоўвацца, прынюхвацца, хадзіць — дзейнічаць. Большасьць людзей наогул ня можа сядзець спакойна, яны ці то пастукваюць пальцамі па стале, ці то качаюць шарыкі з хлебнага мякішу. Іхныя вочы й вушы насьцярожаныя, пільныя, як у жывёлы. Не памылісься, сказаўшы, што жывапіс і музыку ўспрымае нават котка, а вось задумвацца можа толькі чалавек і зусім ня кожны.

◦ ◦ ◦

Ёсьць асобы, якія падпарадкавалі свой розум воку — жывапісцы, ёсьць асобы, якія ставяць найвышэй гук — музыкі, а трапляюцца й такія, што найперш шануюць пахі — парфумэры. З лупатых, вушатых, насатых, рукатых ды языкатых складаецца большасьць чалавецтва.

## 5. Асоба

∘ ∘ ∘

Палітык, як і ўся палітычная дзейнасьць, ня можа быць вытанчаным. Да такой высновы прыходзіш, разглядаючы газэтныя й тэлевізійныя твары генсекаў, прэзыдэнтаў, правадыроў і тыранаў.

∘ ∘ ∘

Сапраўдны ўладар не баіцца сваіх падданых і не чакае ад іх нічога кепскага... Сказаў Вавэнарг. Шкада, што францускі мараліст не ўдакладніў: у рэальнасьці такіх сапраўдных уладароў не існуе.

∘ ∘ ∘

Адсутнасьць альбо недахоп гонару, самасьці, ягамосьці ў кіраўніка дзяржавы вядзе да гнюснае заганы — да млявасьці. Праз тую млявасьць уладара вяне, чэзьне, марнее ўся дзяржаўнасьць цалкам.

∘ ∘ ∘

Так, Людовік XIV — выбітны кароль, я ў захапленьні ад яго, але не хацеў бы на-

радзіцца сярод ягоных падданых... Вавэнарг так сказаў толькі пра аднаго з каралёў, а я ўпэўнены: так гавораць пра ўсіх вялікіх уладароў, што адышлі, і думаюць пра тых, хто жыве й кіруе.

∘ ∘ ∘

Агульнапрынятыя нормы і перакананьні зьмяняюцца значна хутчэй за асабістыя.

∘ ∘ ∘

Як ўражаньне ад уласнага голасу не супадае з пачутым іншымі, так і меркаваньні пра цябе не супадаюць з самаацэнкамі.

∘ ∘ ∘

У тэксты ўчытвайся, у музыку ўслухоўвайся, у малюнкі ўглядайся... Так нарэшце зможаш пабачыць, пачуць і зразумець самога сябе.

∘ ∘ ∘

Літаратар ня ведае сваіх чытачоў, як мастак незнаёмы са сваімі гледачамі, а музы́ка — са слухачамі. Так можна адказаць на пытаньне Франсуа дэ Лярашфуко: «Чаму мы запамінаем з усімі драбніцамі тое, што з намі здарылася, але ня здатныя запомніць, колькі

разоў мы распавядалі пра гэта адной і той жа асобе?»

∘ ∘ ∘

Навучыся адрозьніваць тых, хто ўладкоўваецца ў мяккім фатэлі, і тых, хто сядае на мулкі зэдлік.

∘ ∘ ∘

Лепей цалкам сур'ёзна хваліць сябе, чым жартам ставіць на катурны ідыёта.

## 6. Паводзіны

° ° °

У наш час воля да ўлады сканчаецца пісаньнем папяровых законаў і ўдзелам у тэлешоў.

° ° °

Калі прачытаеш, што «менавіта палітыкі — сапраўдныя філёзафы», жаданьне быць філёзафам выпарваецца. Лепей заставацца вясёлым літаратарам.

° ° °

Я пагадзіўся б жыць пад прыгнётам тырана пры ўмове, што буду залежны толькі ад ягоных прымхаў і свабодны ад дэспатызму моды, звычак, забабонаў; законнасьць — найлепшая форма рабства... Так разважае Вавэнарг. Але тыран таму і тыран, што не зважае ні на якія законы.

° ° °

Ці супярэчыць розуму й справядлівасьці любоў да самога сябе?.. Пытаецца Вавэнарг. Для мяне, разумнага эгаіста, адказ вядомы. Лю-

боў да самога сябе не супярэчыць розуму й справядлівасьці. І чаму нам так хочацца, каб сябелюбства заўсёды лічылася заганаю? Працягвае Вавэнарг. Па-першае, ня ўсім нам, а па-другое, не заўсёды. І доказ таму — два папярэднія пытаньні Люка дэ Клап'е дэ Вавэнарга.

∘ ∘ ∘

Задумваючы рызыкоўную справу, сто адзінаццаць разоў падумай пра самога сябе і — рызыкуй.

∘ ∘ ∘

Калі думаеш пра сябе, прыходзіш да высновы: нельга быць выбітным штохвіліны. А вось аналізуючы лёсы й біяграфіі выдатных творцаў, пераконваесься: выдатным можна быць заўсёды і ва ўсім. Дыяген Сынопскі выдатны нават тым, што жыў у бочцы.

∘ ∘ ∘

Каб перастаць зайздросьціць, лічы сябе ня горшым за іншых, а лепшым.

∘ ∘ ∘

Павага іншых людзей залежыць ад стаўленьня да самога сябе. Ніхто ня будзе цаніць чалавека, які сам сябе нізка ставіць.

○ ○ ○

Эгаістычныя паводзіны — пошук спакою.

○ ○ ○

«На мой век хопіць...» — запэўнівае маладасьведчаны эгацэнтрыст і памыляецца.

○ ○ ○

Супроцьстаяць сабе можаш толькі сам. Пазьбегнуць такога ваяўнічага стану лёгка: адмоўся ад цяжкай хады.

○ ○ ○

Не адказвай на пытаньне раней, чым яго пачуў.

○ ○ ○

Ня думай пра ўласныя здольнасьці, бо нават гэтым прыніжаеш апанэнтаў.

○ ○ ○

Як найхутчэй вырашай пабытовыя дробязі, зь іх складаецца чалавечы апакаліпсыс.

∘ ∘ ∘

Выкідаеш кніжку на сьметнік? Памятай, яшчэ пашкадуеш, але не спыняйся і выкідай. Замахнуўся нажом? Бі насьмерць.

∘ ∘ ∘

Парада зьневажае суразмоўцу. Настаўнік заўсёды прыніжае вучня. Каб пазьбегнуць помсты за зьнявагі і прыніжэньні, давай парады сабе.

∘ ∘ ∘

Выслухай параду, але не сьпяшайся яе выконваць, пачакай нагоды.

∘ ∘ ∘

Саромецца ўласных геніталіяў такое ж глупства, як і ганарыцца іх формамі й памерамі. Але ганарыцца ўсё ж лепей, чым саромецца.

∘ ∘ ∘

Калі ня знойдзеш добрага занятку, цябе захопіць што-небудзь кепскае. А як ня будзеш займацца разумнымі рэчамі — сьвядомасьць апануюць заганныя думкі.

○ ○ ○

Калі табе не падабаюцца паводзіны лысага, пахвалі ягоныя валасы, што пакінулі неразумную галаву.

○ ○ ○

Справакаваць дурнога чалавека на брахню досыць лёгка, дастаткова назваць яго вар'ятам.

○ ○ ○

Сапраўдны сацыяліст той, хто ня хоча мяняць свой сацыяльны статус.

○ ○ ○

Нацыяналіст — гэта гісторык, які стварае рамантычнае мінулае нацыі.

○ ○ ○

Кароль жыве ў кожным чалавеку; кепска толькі, што большасьці каралёў не хапае служак.

○ ○ ○

Паміж сьмеласьцю й безразважнасьцю няма мяжы.

∘ ∘ ∘

Аскетызм паходзіць не ад сквапнасьці, а ад шчодрасьці.

∘ ∘ ∘

Тэрарыст уваходзіць у вечнасьць праз асьляпляльную яркасьць аднаго імгненьня.

∘ ∘ ∘

Экстрэмізм — шлях лайдакоў.

∘ ∘ ∘

Караля робіць сьвіта. Або суседняя дзяржава.

∘ ∘ ∘

Калі ты дамовісься з сабою, ёсьць надзея, што паразумеесься зь іншымі.

∘ ∘ ∘

Трэба рабіць непатрэбнае.

∘ ∘ ∘

Як гэта зноў навучыцца спакойна чакаць?

∘ ∘ ∘

Чым болей жаданьняў, тым больш прыніжэньняў.

∘ ∘ ∘

Паразуменьня не дасягнеш прымусам.

∘ ∘ ∘

Запросяць — пагаджайся.

∘ ∘ ∘

Майстры працуюць у майстэрнях, бо майстэрства — найперш служба.

∘ ∘ ∘

Выказваць недавер — глупства, лепш выкажы давер.

∘ ∘ ∘

Не разумееш — не асуджай.

∘ ∘ ∘

Каб перамовы мелі посьпех, табе давядзецца ахвяраваць інтарэсамі хаўрусьнікаў.

○ ○ ○

Любую абстрактную параду варта ператварыць у параду самому сабе, каб убачыць яе сапраўдныя вартасьці.

○ ○ ○

Зьмена паводзінаў — найцяжэйшае з мастацтваў.

○ ○ ○

Не бывае больш сумнага занятку, чым імітацыя весялосьці. Спачувай блазнам.

○ ○ ○

Чытачы лёгка падзяляюцца на садыстаў і мазахістаў, садысты чытаюць Захер-Мазоха, а мазахісты — маркіза дэ Сада.

○ ○ ○

Рабы служаць гаспадарам, а кепскія людзі — страсьцям... Сьцьвярджаў Дыяген. У такім разе лепей быць рабом пры разумным уладары, але гэта фантастычная пэрспэктыва.

∘ ∘ ∘

Дыяген абраў для жытла бочку, бо брэх у ёй і больш гулкі, і гучнейшы, і густы. Нездарма ён адзначаў сваё падабенства да настаўніка сьпеваў, які знарок бярэ іншы тон, каб вучні зразумелі — як трэба сьпяваць ім самім.

∘ ∘ ∘

Калі прачытаў, што Дыяген ніколі не насіў абутку, бо ногі менш далікатныя за твар і вочы, і ён ніколі ня бачыў, каб чалавек хадзіў з вачыма, абутымі, як ногі, то падумаў, што акуляры кінік зьнелюбіў бы яшчэ болей за чаравікі. Толькі патрушчыць акуляры лепш за ўсё абцасам мужчынскага боту.

∘ ∘ ∘

Дыяген заўважыў, што асноўнае спаборніцтва між людзьмі зводзіцца да скіданьня адзін аднаго пендалямі ў канаву. Мінула два тысячагодзьдзі, а Ніцшэ са сваім «падштурхні таго, хто падае» і Камю з «такой халоднай вадою», у якой топіцца самагубца, так і стаяць разам з намі на беразе бруднай Дыягенавай канавы.

ο ο ο

«Да жывых варта ставіцца зычліва, а вось пра мёртвых трэба казаць толькі праўду», — прачытаў у Вальтэра і зазначыў вельмі рацыянальны падыход да ўласных паводзінаў. Адзінае, што варта дадаць, — калі зьбіраесься казаць праўду пра мёртвых, памятай пра ўласную сьмерць.

ο ο ο

«Людзі вельмі мала цэняць выпадак зрабіць радасьць блізкаму; часам здаецца, што яны займаюць пасаду толькі дзеля таго, каб мець магчымасьць рабіць паслугі, але не карыстацца ёю самому; першае, што прыходзіць ім на розум — адмаўляць; а вось згоду яны даюць, толькі добра падумаўшы», — разважае дасьціпны мараліст Жан дэ Лябруер у сваім афарыстычным творы «Характары, або Норавы цяперашняга веку» і памыляецца, бо папрашайкі выклянчваюць у цябе ні што іншае, а пасаду, якую ты займаеш, а самае непрыемнае — абяцаньні і клятвы, што яны будуць на гэтай пасадзе больш сьціплыя, больш сумленныя, больш добрыя за цябе, толькі дазволь, толькі пусьці... Зрэшты, радасьць, зробленая нават вельмі блізкаму чалавеку, каштуе значна менш, чым страта, нанесеная самому сабе.

∘ ∘ ∘

Ня трэба дзейнічаць і гаварыць, нібыта ў сьне... Павучае Геракліт. І можна было б не спрачацца са старажытным грэкам, што толькі «для нядрэмных існуе адзіны й агульны космас (а той, хто сьпіць, павернуты ў свой уласны сьвет)», каб не паўсонны стан, у якім ты пішаш ці чытаеш таго ж Геракліта.

∘ ∘ ∘

На высокую вежу можна ўзьняцца толькі па вітых сходах... Афарызаваў Бэкан. Наіўны, ня ведаў ліфта.

∘ ∘ ∘

Нават калі чалавек сыходзіць ад людзей і пачынае жыць толькі з жывёламі ды птушкамі сярод расьлінаў, ён імкнецца давесьці ўласную праўду менавіта людзям, а ня птушкам, жывёлам і расьлінам. Згадай хоць бы Генры Дэвіда Тора, які сыходам у лес выказаў пратэст супраць грамадзтва.

∘ ∘ ∘

Немагчыма выйсьці за межы ўласнай індывідуальнасьці, але варта паспрабаваць.

○ ○ ○

Унутраная пустэча й незадаволенасьць — вось што гоніць чалавека ў суполкі, у вандроўкі й на чужыну... Прачытаеш у Шапэнгаўэра. Але ёсьць жа стома ад самога сябе, ад навакольнага краявіду, ад перанасычанасьці звыклым. Тады, каб адчуць смак адзіноты, руш у падарожжа ці ўдзельнічай у спрэчках.

○ ○ ○

Было б добра, каб ты зразумеў, што існуюць чатыры арыстакратыі: арыстакратыя ўлады, арыстакратыя капіталаў, арыстакратыя розуму й арыстакратыя ад нараджэньня. І было б яшчэ лепей, каб ты не рабіў спробы садзіцца адразу на чатыры крэслы.

○ ○ ○

Задумвайся не над набыткамі, а над стратамі. Радуйся не прыдбанаму, а нязгубленаму. Лепей сьвядома аддай, чымся выпадкова займей.

○ ○ ○

Найбольш папрокаў выслухоўваеш з-за непасьлядоўнасьці. Ну, а як можна быць пасьлядоўным, калі сама прырода выступае супроць заплянаванасьці?

∘ ∘ ∘

Калі ня знойдзеш сабе занятак, ён сам знойдзе цябе. У большасьці сваёй гэта будзе нікчэмная й пустая страта часу: п'янства, распусныя вандроўкі, глядзеньне ў тэлескрынку...

∘ ∘ ∘

Бязьдзейнасьць — рэч пакутлівая, амаль незьдзяйсьняльная. Толькі вельмі мужны чалавек можа абраць бязьдзейнасьць за асноўны занятак.

∘ ∘ ∘

Забывацца на кепскія ўчынкі іншых — яшчэ паўбяды, а запамятаеш уласныя кепствы, дык лічы — згалеў.

∘ ∘ ∘

Пастаяннасьць зьменаў стоміць і адначасна супакоіць.

## 7. Веды

∘ ∘ ∘

Настаўнікаў заўсёды менш, чым падручнікаў.

∘ ∘ ∘

Развагі пра ўзаемазалежнасьць рэчаў стамляюць ня менш за чаканьне перад зачыненымі дзьвярыма.

∘ ∘ ∘

Ведаеш: усё папулярнае — кепскае; але ведаць недастаткова, каб умець тое рабіць, а тым больш — выкарыстоўваць.

∘ ∘ ∘

Развагі селяніна часам больш рацыянальныя за часопісную эсэістыку навукоўцаў.

∘ ∘ ∘

З дакладным веданьнем сваіх жаданьняў жывецца лягчэй; няведаньне, як цемра, поўніцца небясьпекаю.

∘ ∘ ∘

Калі сапраўды зьбярэсься вучыць іншых, не забудзься ўзяць кій ды надзець шлем.

## 8. Здароўе

○ ○ ○

Сумная ісьціна... Здароўе чалавецтва вызначаецца па колькасьці хворых.

○ ○ ○

Калі ты хоць на імгненьне навучысься грэбаваць жыцьцём, ты пазбавісься страху ўчыніць самагубства.

○ ○ ○

Вар'ят варты сардэчных адносінаў і спачуваньня, але дзеля яго ж і трэба трымаць напагатове кашулю з даўжэзнымі рукавамі.

○ ○ ○

Мэдыцына — найпапулярнейшая ў XX стагодзьдзі форма рэлігіі.

○ ○ ○

Лекі нараджаюць хваробы.

## 9. Вайна

○ ○ ○

Слабыя душой, на думку Вавэнарга, упэўненыя, што разбурэньне — верная прыкмета сьмеласьці й магутнасьці. Так яно і ёсьць, але слабыя й моцныя духам тут ні пры чым.

○ ○ ○

Мір — кароткая пярэрва паміж войнамі, прысьвечаная пераўзбраеньню й рэформам у арміі.

○ ○ ○

Хто ведае, можа, менавіта страсьцям абавязаны розум самымі бліскучымі сваімі заваёвамі, — пакеплівае са стоікаў і аскетаў Вавэнарг. Можа й так, толькі словазлучэньне «заваёвы розуму» выдае акупанта, які ўвесь час прамалёўваецца ў постаці маралiста Вавэнарга.

○ ○ ○

Мусіць, я ня першы, хто заўважае, што вайсковую форму вельмі любяць ідыёты. І як

сумна, што на вуліцах гэтай формы ўсё болей і болей.

○ ○ ○

Вайсковы патрыятызм вырастае зь нянавісьці да суседзяў, а тая нянавісьць грунтуецца на зайздрасьці... І варта памятаць: зайздросныя ваяўнічыя барбары зруйнавалі Рым.

○ ○ ○

Хто хоча міру, хай рыхтуецца да вайны... Зазначыў старажытнарымскі пісьменьнік Вэгецый. Толькі падрыхтоўка да вайны — вайна, а ня мір, як і ўрачыстае сьвяткаваньне перамогі над ворагамі — працяг вайны.

○ ○ ○

Зьнішчы грошы — і зьнікнуць войны... Спадзяваўся старажытнарымскі аратар Квінтыліян. Дарэмныя спадзяваньні. Б'юцца, ваююць, забіваюць і за кавалак акрываўленага мяса.

○ ○ ○

Старажытнарымскі паэт Клаўдыян выказаўся пра перамогу так: «Сапраўдная перамога толькі тая, калі самі ворагі прызнаюць сябе пераможанымі». А я сумняваюся,

што сэрца чалавека, які падпісвае капітуляцыю, пагаджаецца з тым, што робяць розум і рука.

○ ○ ○

Ёсьць клясычнае выказваньне: калі двое б'юцца, трэці радуецца. А ці не азначае гэта, што калі двое паміраецца — трэці заплача?

○ ○ ○

Калі становісься на бок пацыфістаў, варта памятаць, што вайскоўцы ведаюць старажытнае правіла: у адносінах да ворагаў усё дазваляецца.

○ ○ ○

Вайскоўцы любяць вайскоўцаў, нават вайскоўцаў варожых дзяржаваў, і ненавідзяць пацыфістаў, асабліва суайчыньнікаў.

○ ○ ○

«Перамогі ня будзе!» — менавіта з такім перакананьнем ідзеш на бой.

○ ○ ○

Войска выбудоўваецца, каб разбураць.

∘ ∘ ∘

Сьмелы ваяр — гэта найперш пакорлівы раб.

∘ ∘ ∘

Злапамятнасьць і зларадднасьць — два слупы, на якіх трымаецца нацыянальная годнасьць, бо нацыя не павінна нікому дараваць нават дробныя напады на свае правы. Таму на занятках гісторыі ты вывучаў розныя крыўды, бойкі ды войны. Вось таму на ўсіх скрыжаваньнях услаўляюцца забойствы, забітыя ды крыважэрнасьці, названыя подзьвігамі. Вось і сьвяткуюцца ваенныя перамогі ўсенародна. Ня ўдзельнічай у гэтых урачыстасьцях.

∘ ∘ ∘

Асэнсоўваць непатрэбнасьць усялякай вайны варта ў цішыні й на адзіноце, бо ў акопе пра вайну не падумаеш.

∘ ∘ ∘

Каб ператрываць чорныя часы, бывае дастаткова ўявіць чарнейшыя хвіліны.

∘ ∘ ∘

На першы погляд, дзяржава — зьява антыпрыродная, бо яна імкнецца забараніць дзьве з асноўных праяваў эвалюцыі: падман і забойства. Але пры больш пільным разглядзе заўважаеш: калі з дапамогаю законаў ды пакараньняў дзяржава здольная збольшага забараніць гэтыя праявы на ўласнай тэрыторыі, дык адразу ж распачынаецца вайна з суседнімі дзяржавамі, яна сама пачынае падманваць і забіваць. Дзяржава вымушаная забіваць чужых і сваіх, каб не забівалі адно сваіх. Дзяржава — прыродная пабудова, як статак, як зграя, як гайня.

∘ ∘ ∘

Моц халаднакроўных гадаў у тым, што яны здатныя ня толькі ўкусіць, але і атруціць. Кінжал ды келіх з атрутаю — твая зброя, калі разумны й мужны. Зрэшты, атруту можна выпіць самому, не раўнуючы. Як Сакрат.

## 10. Гвалт

∘ ∘ ∘

Усялякая мараль сканчаецца ў кропцы, зь якой пачынаецца пошук задавальненьняў ад пакут жывёлаў, людзей, народаў, краін...

∘ ∘ ∘

Тыраніі ўласьцівая гарачкавая імпульсыўнасьць, пачуцьцёвасьць, безразважнасьць, а яе ўвесь час спрабуюць аналізаваць з пазыцыяў сьветлага розуму й халоднай лёгікі.

∘ ∘ ∘

Спачатку ты палохаесься, потым баісься і, урэшце, ня можаш адмовіцца ад гвалтоўнага ўчынку.

∘ ∘ ∘

Нацыя, якая забівае тырана, становіцца на шлях гвалту й падтрымлівае цэласнасьць сваёй дзяржавы з дапамогай бясконцых злачынстваў. Зрэшты, нацыя, якая забівае забойцу, ня лепшая за нацыю, што забівае караля, бо кароль і зьяўляецца перш-наперш забойцам, гвалтаўнікОм і тыранам.

∘ ∘ ∘

Нельга ўладарыць бязьвінна. Але ў больш спакойных дзяржавах уладараць прайдзісьветы, махляры й злодзеі, а ў дзяржавах ваяўнічых кіруюць адно забойцы. Таму, абіраючы кіраўніка дзяржавы, трэба аддаць перавагу хітраму махляру, каб не зрабіцца закладнікам бескарысьлівага гвалтаўніка.

∘ ∘ ∘

Найгоршае з забойстваў — зьнішчэньне бацькоў. Гэта вяршыня гвалтоўнага паўстаньня супраць прыроды, лёсу, Бога. Менавіта да бацьказабойства заклікаюць рэвалюцыянэры: «Разбураць да падмуркаў!», «Выцерці радзімыя плямы!», «Рэвалюцыя вышэй за ўсё!» Рэвалюцыйнае разуменьне сацыяльнай роўнасьці натыкаецца на сьцяну ўзаемаадносінаў дзяцей з бацькамі й дзядамі. Пачынаецца бессэнсоўнае змаганьне маладых са старымі.

∘ ∘ ∘

Толькі сам тыран выдае нацыі індульгенцыю з правам на паўстаньне, на гвалт і на пакараньне сьмерцю ўласнай асобы.

○ ○ ○

Калі гвалтаўнік заклікае зьнішчыць людзей выдатных, народ з задавальненьнем пачынае забіваць тых, хто вылучаецца з натоўпу; паступова даходзіць чарга да гвалтаўніка, і крык: «Я ж такі, як і вы!» — не ўратоўвае.

○ ○ ○

Гвалтаўнік абапіраецца на спрошчанае вызначэньне свабоды. Для яго свабода — гэта магчымасьць падпарадкаваць кожнага сваім жаданьням. Гвалтаўнік не спыняецца; падпарадкаваўшы людзей, ён захоплівае іншыя дзяржавы і, што самае дзікае, — пачынае змагацца з прыродаю: выпростваць рэкі, злучаць моры й акіяны... Ловіць вецер, адным словам.

○ ○ ○

Паводзіны гвалтаўніка вельмі імпульсыўныя, ён на кожным кроку рызыкуе, парушае законы, ігнаруе выпадковасьці і жыве паводле правіла: я зраблю табе любое зло, якое толькі захачу, а ты гэтаксама рабі мне зло, якое зможаш.

○ ○ ○

Гвалтаўнік — гэта ахвяра й кат у адной асобе; кульмінацыяй гвалту, відавочна, будзе самазьнішчэньне.

∘ ∘ ∘

Рэвалюцыйныя хваляваньні выносяць на вяршыню ўлады гвалтаўнікоў, бо менавіта яны абяцаюць спыніць і нарэшце спыняюць гэтыя ж рэвалюцыйныя хваляваньні.

∘ ∘ ∘

Зьнявага прыроды — вось мара шчырага гвалтаўніка, але ў гэтым шчыраваньні ён расплываецца ў бясконцасьці, а прырода застаецца абыякавай. Таму ўвесь час у мяне ўзьнікае жаданьне сказаць гвалтаўніку адно слова: «Супакойся».

∘ ∘ ∘

Гвалт будуецца на празьмернасьцях, таму ворагі ягоныя — бязьмежнасьць, цішыня, спакой.

∘ ∘ ∘

Гвалтаўнік знаходзіцца ў стане пэрманэнтнай барацьбы з уласнымі страхамі. Ён ведае, што спалох вядзе да страты ўлады, а таму ў халодным поце прымае самыя неверагодныя паставы, якія мусяць дэманстраваць сьмеласьць і рашучасьць. Гвалтаўнік верыць у свой тэатар, бо ведае: як толькі

апусьціцца заслона, Сьмерць здыме ягоную гарачую галаву.

◦ ◦ ◦

Чалавек адрозьніваецца ад жывёлы тым, што добра ведае, як зручна нападаць удваіх на аднаго.

◦ ◦ ◦

Бунт — рэалізаваная мара рабоў.

◦ ◦ ◦

Не сумнявайся, народ залічыць тырана ў вялікія дабрадзеі, калі ён выпусьціць з турмы цябе, якога сам жа пасадзіў без усякай тваёй віны.

◦ ◦ ◦

Дэспат хавае злыя дзеяньні за добрымі словамі.

## 11. Палітыка

∘ ∘ ∘

Патрыёт у сваіх палымяных прамовах апэлюе да пачуцьцяў, да Радзімы, да крыві. Розум і дух чужыя для патрыёта. На гэтай глебе й сыходзяцца патрыёты з дыктатарамі.

∘ ∘ ∘

Мара любога тырана — ня столькі гвалт над жанчынамі, колькі ўсынаўленьне іхных дзяцей, пабудова такога грамадзтва, дзе ўсе дзеці належаць дзяржаве і, адпаведна, падпарадкоўваюцца тырану. Адсюль і «бацька нацыі».

∘ ∘ ∘

Дэмакратыя — волевыяўленьне падвяселенага нядзельнага натоўпу.

∘ ∘ ∘

Выйграе той палітык, які не забывае пра схільнасьць народу да пакоры. Змагацца цяжэй, чым скарыцца.

∘ ∘ ∘

Тыран раздае ўзнагароды й пасады найгнюсьнейшым зь лісьліўцаў, каб хоць бы на нейкі час пазбавіцца ад іх.

∘ ∘ ∘

Папулярнасьць фармуецца ў нетрах натоўпу, які прагне яскравых праяваў сьляпога лёсу. Адсюль і Папялушка зь ператварэньнем у прынцэсу, і прэзыдэнт зь сялянжабракоў.

∘ ∘ ∘

Кожная нацыя сьмяецца зь іншых, тым часам як іншыя насьміхаюцца зь яе. Шкада, што з тваіх беларусаў кпяць вельмі мала.

∘ ∘ ∘

Пазьбягай дзяржаўных узнагародаў.

## 12. Праца

○ ○ ○

Робячы вялікую справу, ты ня зможаш абысьціся без таго, каб не нарабіць непатрэбшчыны і не стварыць нікчэмнасьцяў.

○ ○ ○

Ведаеш, вораг не павінен здагадвацца пра твае пляны, але толькі ён можа ацаніць іх каштоўнасьць. Таму так і карціць паказаць ворагу пэрспэктыўныя распрацоўкі, а выйшаўшы за дзьверы, шпурнуць іх у сьметнік. Галоўнае — не складай пляны з тымі, хто йдзе іншым шляхам.

○ ○ ○

Захапляцца ўласнай працаю найлепей у цішыні ўласнага кабінэту, сам-насам.

○ ○ ○

Праца пазалотчыка заўсёды карыстаецца большай увагай, чым праца дойліда... Крыўдуе мараліст Вавэнарг. І дарэмна. Па-першае, кожны дойлід пры жаданьні можа працаваць пазалотчыкам. Па-другое, сам Вавэнарг

у літаратуры — больш ювэлір і пазалотчык, чым дойлід.

◦ ◦ ◦

Нават падробка пад мудрасьць — ужо філязофія... Казаў Дыяген Сынопскі. Сапраўды, каб навучыцца нешта рабіць, спачатку неабходна ўмець тое нешта падрабляць.

## 13. Час

∘ ∘ ∘

На транспартных прыпынках ня толькі сам спыняесься, але й час замаруджваецца, і ты спрабуеш яго падштурхоўваць позіркам на гадзіньнік.

∘ ∘ ∘

У замкнёнай невялікай прасторы час паўзе. Ты імкліва ляціш у самалёце, а час пасоўваецца марудна, нібыта ў турэмнай камэры.

∘ ∘ ∘

Вельмі павольна хвіліны цякуць у чэргах. Наогул, чарга — сымбаль маруднасьці.

∘ ∘ ∘

Для пацыента ў бальніцы час цяжкі, доўгі і маркотны.

∘ ∘ ∘

На паседжаньнях, сходах, канфэрэнцыях час ідзе нясьпешна. У якасьці доказу на ста-

лах і крэслах застаюцца скрэмзаныя шматкі паперы. Бяздумнае крэсьленьне на аркушах імітуе дзейнасьць і запаўняе час.

∘ ∘ ∘

Назіраньне за стрэлкамі і цыфэрблятам істотна замаруджвае час. Побач з храномэтрамі імгненьні ператвараюцца ў хвіліны. Калі ты чакаў каханую пад гадзіньнікам, дык ведаеш месца, дзе час плыве марудна.

∘ ∘ ∘

У ложку з каханай жанчынаю час пралятае імкліва, як нідзе.

∘ ∘ ∘

На барцоўскім кіліме, на рынзе, на футбольным полі, на баскетбольнай пляцоўцы час рухаецца хутка, але найхутчэй ён бяжыць на полі бітвы, у рукапашнай бойцы.

∘ ∘ ∘

За картачным сталом гадзіны ператвараюцца ў хвіліны. Азарт зьядае час, як воўк — ягня.

∘ ∘ ∘

Каля магнітафону, тэлевізару, кампутару час паскараецца. Тэлефон гэтаксама здатны ўсмоктваць хвіліны.

∘ ∘ ∘

У жытнёвым полі, на санцагрэі можа ўзьнікнуць жаданьне спыніць час — не прыпыніць, не замарудзіць і не паскорыць, а забіць. Вінцэнт Ван Гог і застрэліўся, ахоплены пякельнай прагаю забіць час пасярод жытнёвага поля. У беларускім фальклёры ёсьць вобраз пачвары, якая ўзьнікае ў самы санцасьпёк апоўдні — Кадук. Ён здатны глынаць людзей, жыцьцё й час.

∘ ∘ ∘

А дванаццатай ночы, на адзіноце, у пустым памяшканьні само сабою зьяўляецца памкненьне прыпыніць час. Асабліва моцна жаданьне выяўляецца ўзімку, калі ночы бясконца-доўгія. Можа, таму так урачыста, ярка, вогненна сьвяткуецца Новы год.

∘ ∘ ∘

На золку, пасьля пакутлівага бяссоньня ледзь стрымліваесься, каб не паквітацца з часам раз і назаўсёды.

∘ ∘ ∘

Мы нядатныя ўбачыць будучыню, бо жывем тварам да мінуўшчыны.

∘ ∘ ∘

Машына часу ёсьць у кожнага чалавека — гэта памяць.

∘ ∘ ∘

Гадзіна ў дзіцяці ўтрая даўжэйшая за гадзіну ў дарослага, а яму ўсё адно мала. Маці кліча, а яно — ну, яшчэ пяць хвілінак!

## 14. Грошы

○ ○ ○

Запэўніваць адукаванага чалавека ў тым, што бяднейшы лепшы за багатага — неразумна. Бяднейшы найперш бяднейшы розумам, а як вынік — грашыма.

○ ○ ○

Папракаючы жабрака, ты адмаўляеш яму ў спачуваньні і правільна робіш. Прысаромлівай жабракоў. Хай ён роту не пасьпее адкрыць, а ты скажы: «Дайце мне грошай на хлеб».

○ ○ ○

Забраць грошы значна цяжэй, чым іх даць, асабліва цяжка вярнуць назад грошы пазычаныя.

○ ○ ○

Баяцца трэба ня жорсткіх уладароў і заможных людзей, а зайздросных нябог і агрэсіўных жабракоў, якім няма чаго губляць.

○ ○ ○

Хлеб, намаляваны мастаком, як і хлеб, паказаны ў тэлевізіі, каштуе значна больш за сапраўдны; у гэтым і хаваецца найвялікшая эканамічная памылка чалавека.

○ ○ ○

Вядома, сярод багатых вельмі рэдка сустрэнеш мудрага чалавека, але сярод бедных такога знайсьці яшчэ цяжэй.

○ ○ ○

З кім пагаворыш пра багацьце, калі і золата, і дыямэнты маўчаць? Застаецца шаптацца пра грошы з папераю.

○ ○ ○

Капітал, як стары зводнік, заваблівае наіўных у сьвет перажываньняў, турботаў і няпэўных пэрспэктываў. Толькі бедны шукае ў капітале свабоду й незалежнасьць.

○ ○ ○

Калі абмяркоўваюцца галеча ці багацьце, ня трэба параўноўваць іх з уласнымі стратамі або набыткамі, бо гэта непрыстойна.

° ° °

У зьменлівым сьвеце няма нічога вартага глыбокіх перажываньняў, і грошы — не выключэньне.

° ° °

Наяўнасьць у доме вялікага багацьця, як і прысутнасьць у горадзе безьлічы салдатаў, спакою не дадае.

° ° °

Месяц, пабыўшы поўняю, робіцца ветахам; справа дасягае росквіту й прыходзіць у заняпад. Усё, што даходзіць да кульмінацыі, набліжаецца да разбурэньня — такі закон. Каб захаваць грошы й багацьце, трэба мяняць справы й шукаць новыя шляхі заробку. Правіла актуальнае ня толькі для заможных, але й для бедных.

° ° °

Існуе зваротная сувязь у паводзінах. Пасядзі на занятках, зрабіўшы твар ідыёта, — нічога не зразумееш і не запомніш. Нельга малпаваць злодзея, жабрака, няздару. Маскі хутка прырастаюць да твараў. Каб стаць заможным, трэба спачатку стаць падобным да заможных і разумных, а не супрацьпас-

таўляць сябе ім і скаліць зубы з «новых беларусаў».

∘ ∘ ∘

За выкананьне камэрцыйных праектаў варта брацца гэтаксама неадкладна, як за напісаньне хоку ў час азарэньня.

∘ ∘ ∘

Па́даюць там, дзе сто разоў прайшлі, як і тонуць зазвычай вельмі добрыя плыўцы. Тое самае з багацьцем... Бядняк ня можа згубіць шмат грошай, хоць ён зусім не асьцярожны. Капітал — гэта найперш — сквапнасьць, асьцярожлівасьць і плянамернасьць.

∘ ∘ ∘

Калі займаесься бізнэсам, разумееш: грошы, здабытыя вялікімі намаганьнямі, і грошы, прыдбаныя лёгка, роўныя ў цане, хоць з гэтым цяжка зьмірыцца.

∘ ∘ ∘

Чалавеку заможнаму даводзіцца ўвесь час асьцерагацца злодзеяў, бо людзі бедныя, калі губляюць месца працы, пачынаюць красьці і думаюць, што ў багатага скрасьці лягчэй, хоць гэта й ня так.

∘ ∘ ∘

Нельга спазнаць іншых, не спазнаўшы сябе; так не заробіш грошы для чужога, не зарабіўшы для сябе, сваіх родных і блізкіх. У багатага шмат сваякоў ды кампаньёнаў і няма сяброў.

∘ ∘ ∘

Калі ты сам лічыш усё заробленае чыстым і сумленным, дык лёгка пераносіш крыклівыя нараканьні, зайздросныя пагляды й злосныя выпады.

∘ ∘ ∘

Найгоршая хвіліна ў бізнэсовых справах надыходзіць тады, калі кампаньён кажа: «Я выходжу са справы й забіраю сваю долю!»

∘ ∘ ∘

Ведаючы ўласныя недахопы, значна хутчэй вучысься памнажаць капітал. Замест таго, каб выхваляцца здабыткамі, пачынаеш ганіць сябе прылюдна, чым выклікаеш спачуваньне й павагу.

∘ ∘ ∘

Калі зьбіраесься кіраваць сьветам ці хоць бы невялікім вытворчым працэсам, трэба найперш быць аскетычным і ашчадным, а грошы, іх колькасьць і наяўнасьць, будуць паказчыкам у працэсе.

∘ ∘ ∘

Досыць цяжка збалянсаваць жаданьні й магчымасьці. Жаданьняў заўсёды шмат, а грошай не стае. Але бываюць і такія часы, калі дробныя жаданьні зьнікаюць. Пачынаеш задаваць сабе пытаньне без адказу: «Ці варта жыць?» Грошы ў падобным стане страчваюць чароўнасьць і магутнасьць.

∘ ∘ ∘

Здаецца, зайздрасьць да тваіх капіталаў не павінна ўзьнікаць у людзей, якія маюць значна больш за цябе, але гэта адбудзецца толькі пры адной умове — калі людзі ня будуць ведаць, колькі ты маеш, і твой капітал не працячэ праз іхныя рахункі.

○ ○ ○

Чым даражэйшы кубак з дробнай расколінай, тым больш непрыемна зь яго піць.

○ ○ ○

Пакупніка адштурхоўвае не вялікі кошт, а кепскі прадукт.

○ ○ ○

Галеча й прыніжанасьць — гэта тое, што людзі ненавідзяць... Заўважаеш у Канфуцыя. Але большасьць не дасягае багацьця й знатнасьці, хоць і імкнецца да іх усёй душою, а таму пачынае разам з галечаю наракаць на высакародных.

○ ○ ○

Сорамна атрымліваць заробак і калі ў дзяржавы ёсьць шлях, і калі яго няма... Знаходзіш у Канфуцыя. Варта зазначыць, што сорамна атрымліваць і ўзнагароды. А колькі людзей імкнуцца ўхапіць як мага больш заробак і найкаштоўнейшыя ўзнагароды? Зрэшты, узнагароды існуюць дзеля суцяшэньня сквапных і зайздрослівых.

∘ ∘ ∘

Цяжка жабраку не займець злосьці... Варта пагадзіцца з Канфуцыем. Дарэчы, я ніколі ня кідаю грошы ў жабрацкую шапку, бо ёсьць іншыя месцы, куды можна падзець вольныя фінансы. А жабрак — ён, апрача што зласьлівы, яшчэ й няўдзячны.

∘ ∘ ∘

Не аспрэчыш наяўнасьць старэйшых і малодшых. Дык чаму розныя змагары за роўнасьць увесь час спрабуюць абвергнуць заканамернасьць існаваньня багацейшых зь бяднейшымі. Мяркую, з-за недасьведчанасьці. Няма роўных сярод роўных.

∘ ∘ ∘

Мець — не азначае ўмець карыстацца.

∘ ∘ ∘

Бедныя бачаць у багацьці праяву лёсу, заможныя — плён уласнай працы.

° ° °

Быць шчодрым вельмі хутка надакучвае, як і хутка збрыджвае цьвярозасьць і разважлівасьць.

° ° °

Заўтрашнія прыбыткі грунтуюцца на сёньняшніх стратах.

° ° °

Багацьце і знатнасьць, набытыя несумленна, Канфуцыю падаюцца воблакам, што праплыло міма. Як сумна, што няма ніводнай аблачынкі, якая б не праплыла міма. Хмаркі нябесныя — вечна вандроўныя.

° ° °

Ты маеш утрая менш, чым маюць цябе. Маёмасьць — палон добраахвотны й салодкі. Кожная прыдбаная рэч толькі павялічвае залежнасьць.

° ° °

Ветлівасьць — умоўнасьць, такая ж самая, як і папяровыя грошы. Калі разумнасьць — залатая манэта, дык ветлівасьць, выхаванасьць, далікатнасьць — зашмаль-

цаваныя ад штодзённага ўжытку банкноты. Толькі памятай: па хлеб ня пойдзеш з залатым талерам.

∘ ∘ ∘

Любоў да золата павялічваецца з узростам.

# III. СЭКС — SEX

*Пра эротыку*

## 1. Каханьне

∘ ∘ ∘

Гісторыя ведае выдатных людзей, якімі рухалі пошукі асалоды альбо каханьне, але я ня памятаю такіх, хто быў бы юрліўцам. Тое, што складае галоўную якасьць адных, не дазваляецца другім нават як слабасьць... Канстатуе мараліст Вавэнарг. Нязгодны. Рафаэль, які ня ўмеў чытаць і памёр на жанчыне, ня менш выдатны за любога Вавэнарга ці Расіна.

∘ ∘ ∘

У гомасэксуалізме і лезьбіянстве зьдзіўляе ня тое, што чалавек кахае істоту свайго полу, а тое што яны ходзяць парамі, жывуць парамі і, апрача ўсяго, рэгіструюць шлюбы. Давядзецца пагадзіцца зь Люкам дэ Клап'е дэ Вавэнаргам, які заўважыў... Чалавек, як істота недасканалая, ня можа існаваць у адзіноце. А так было б добра існаваць адасоблена. Найлепей думаецца, пішацца, працуецца на адзіноце.

∘ ∘ ∘

Большасьць каханак варта браць нахабна, пакуль яны яшчэ не разабраліся ў сваім стаўленьні да цябе.

o o o

Закахаўся? Спрабуй спакусіць жанчыну грашыма або рэчамі, бо асноўная перашкода вашае блізкасьці — тваё моцныя пачуцьці.

o o o

Добра кахацца ва ўласнай кватэры.

o o o

Прыемна займацца каханьнем у пакоі, калі ведаеш, што ў яго ніхто ня зойдзе.

o o o

Няблага ладзяцца эратычныя гульні ў закрытым невялікім басэйне.

o o o

Зручна кахацца ў пакоі ў прастытуткі, калі адкінуць прымхі з забабонамі.

o o o

Асаблівую асалоду прыносіць сэкс на новым ложку, купленым дзеля сямейнай эротыкі і спакойнага сну.

∘ ∘ ∘

Блага кахацца на ложку бацькоў.

∘ ∘ ∘

Непрыемна забаўляцца з каханкаю, калі ёсьць боязь, што нехта назірае за вамі.

∘ ∘ ∘

Блага распачынаць эратычныя гульні ў кватэры замужняй палюбоўніцы. Як бы ты ні намагаўся, але пачуцьцё небясьпекі будзе авяваць сьпіну лёгкім скразьняком.

∘ ∘ ∘

Займацца ў лесе любоўнымі забавамі кепска. Шукаеш-выбіраеш зацішны куток, а калі знайшоў, і кабета абняла цябе, і пачалі вы танец, ахвяраваны Эроту, вось тады й зьяўляецца валацуга. І не каб прайсьці й адвярнуцца, наадварот — стане й пазірае; зразумела, каб дзіця недасьведчанае, а то дарослы чалавек. Зрэшты, і дарослы — зразумела.

∘ ∘ ∘

Не дае наталеньня акт, зьдзейсьнены ў гатэльным нумары. Асабліва раздражняюць крокі на калідоры. Здаецца, вось зараз па-

каёўка пагрукае ў ненадзейныя дзьверы й запрапануе які-небудзь зусім яшчэ непатрэбны ручнік.

∘ ∘ ∘

Займацца сэксам у пакоях уласных дзяцей-падлеткаў няўтульна. Я не пазбаўлены жаданьня выхаваць дзяцей у цноце. Прысутнасьць вялікай колькасьці іхных рэчаў — цацак, кніжак, апранахаў, чаравікаў — не дае разьняволіцца й аддацца сэксу напоўніцу.

∘ ∘ ∘

Калі спалучыш матэматыку з эротыкай, атрымаецца нешта спрошчана мэдыцынскае, накшталт гігіены.

∘ ∘ ∘

Забаўна слухаць хрысьціянскіх артадоксаў, калі пачынаюцца развагі пра «глыбіню цялеснае любові». Асабліва сьмешна гучыць зь іх аблямаваных барадою вішнёвых вуснаў слова «глыбіня».

∘ ∘ ∘

Любіш ня тую жанчыну, зь якою кладзесься ў ложак, а тую, зь якой прачынаесься.

ο ο ο

Апошняя кропля спэрмы нагадвае даволі просты вобраз кропкі пасьля сказу.

Вось і скончыўся акт, але ты яшчэ ня выйшаў, ты расслаблены ў жаночых нетрах, і тут, у разьняволенасьці ды спакоі, без усялякае напругі, як бы сама сабою выштурхоўваецца астатняя кропелька.

І толькі пасьля наплывае сум.

ο ο ο

Ёсьць некалькі рэчаў, да якіх не зьнікае цікаўнасьць на працягу жыцьця. Адна зь іх — полавыя адзнакі.

ο ο ο

Зыркае сьвятло адштурхоўвае ад каханьня.

ο ο ο

Трэньне скуры — аснова эротыкі.

ο ο ο

Эротыка й эратычнае — тое, што маруднае й легкаважнае, а парнаграфія — наадварот — дынамічная, агрэсіўная й яркая.

∘ ∘ ∘

Сустракаць даўнюю каханку крышку сорамна.

∘ ∘ ∘

Каханьне — ахова спакою любімай істоты.

∘ ∘ ∘

Кастапраў і ў каханьні бачыць наступствы хваробы хрыбетніку.

∘ ∘ ∘

Не патрабуй праўды ад каханкі — шчырасьць разбурае каханьне.

∘ ∘ ∘

Рэўнасьць — рашучы крок да страты каханьня.

∘ ∘ ∘

Пра недахопы каханкі гавораць у мінулым часе, як і пра яе цудоўныя якасьці, бо каханка ў сапраўднасьці — таямніца за сямю пячаткамі.

∘ ∘ ∘

Самая раўнівая жонка — нечая кінутая каханка.

∘ ∘ ∘

Захапленьні, як і каханьне, патрабуюць узаемнасьці.

∘ ∘ ∘

Калі пачнеш разглядаць каханьне з боку навукі, а не эротыкі, дык можаш цалкам пагадзіцца з выказваньнем Ляршфуко: «Каханьне найдакладней параўноўваць з гарачкаю: іхныя цяжар і працягласьць ані не залежаць ад нашае волі». Але зводзіць эротыку да мэдыцыны — недаравальная загана абмежаваных матэрыялістаў.

∘ ∘ ∘

Любоў, як і сяброўства, залежыць ад прысутнасьці і адлегласьці. Чым бліжэй чалавек, тым лягчэй захоўваць зь ім добрыя адносіны. А вось каханьне вымагае адсутнасьці, яно йснуе ў тваім уяўленьні. Рэальная прысутнасьць каханага чалавека, ягоная блізкасьць разбураюць цнатлівае пачуцьцё.

## 2. Любоў

∘ ∘ ∘

Не палюбіш сябе, і цябе не палюбяць.

∘ ∘ ∘

У палымянасьці страсьцяў можаш і не заўважыць болю, які прынёс любімаму чалавеку.

∘ ∘ ∘

Самыя высокія думкі, паводле Вавэнарга, падказвае нам сэрца. Карціць дадаць... Сярэднія думкі падказвае страўнік, а нізкія — чэлес. Зрэшты, усё залежыць ад паставы, у якой знаходзіцца цела.

∘ ∘ ∘

Любіць сябе проста, а паважаць — цяжка.

## 3. Мужчына

∘ ∘ ∘

Калі думаеш, што жанчыны цэняць у мужчыну сьціпласьць і памяркоўнасьць, — памыляесься. Каханкі шануюць разбэшчанасьць і напорыстасьць.

## 4. Жанчына

∘ ∘ ∘

Спытай мяне, што больш за ўсё на сьвеце ня любяць прыгожыя жанчыны... Уласны фотаздымак у пашпарце.

∘ ∘ ∘

Узнаўленьне — нязьменная ўмова нашага існаваньня... Жанчына адчувае гэтую ісьціну лепей за мужчыну.

∘ ∘ ∘

У клясыкаў філязофіі, у Вавэнарга ў тым ліку, зьдзіўляе хваравітая неабыякавасьць да жанчынаў.

∘ ∘ ∘

Ёсьць жанчыны, у якіх інтымныя гульні выклікаюць сьмех. Зрэшты, гэта ня так і мала.

∘ ∘ ∘

Павабна глядзіцца жанчына на сініх прасьцінах, цела — жывое золата. Наогул,

эўрапейскім жанчынам больш пасуе цёмная бялізна, а вось азіяцкім — сьветлыя драпіроўкі.

○ ○ ○

Калі стаміўся, а жанчына пад табою возьме й пазяхне, так і закарціць яе ўдарыць.

○ ○ ○

Што можа быць горш, чым застацца самнасам зь непрыгожай і неразумнай жанчынаю?

○ ○ ○

Куды ні глянеш — паўсюль толькі горш. Узрост. Няма таго, што раней было. Паціху старысься. Але ёсьць момант... Усё больш і больш навокал прыгожых, жаданых, павабных жанчын.

○ ○ ○

Непрыгожыя дзявулі, якія са скуры лезуць, каб толькі спадабацца прадстаўнікам супрацьлеглага полу, робяцца падобнымі да жабрачак, што выпрошваюць грошы каля гастраномаў. Дзіўна, але ў адных і ў другіх атрымліваецца дамагчыся свайго, праўда, па драбязе.

∘ ∘ ∘

Жанчына паядае мужчыну. Ратунак у апошняга адзін — уцёкі.

∘ ∘ ∘

Рэўнасьць вынайшлі брыдкія жанчыны.

∘ ∘ ∘

Пажадаю творам Вавэнарга яшчэ й такое... Хай творы выбітнага маралiста прачытае эмансыпаваная злосная сучка.

∘ ∘ ∘

Убачыўшы жанчын, што задушыліся на аліўкавым дрэве, Дыяген Сынопскі прабрахаў: «Вось каб на ўсіх дрэвах такія плады!» У наш час эмансыпацыі гэткую экспрэсію паводзінаў пераўзысьці немагчыма, хіба што нейкая спадніца праверашчыць падобнае пра мужчынаў.

∘ ∘ ∘

Дзеля каго падмалёўвае бровы жонка сьляпога?.. Пытаецца Томас Фулер. Дзеля таго самага Дона Жуана, дзеля якога сьпявае жонка глухога.

## 5. Сям'я

∘ ∘ ∘

Мужчына й жанчына — вечны двубой. Каханьне працягваецца, пакуль няма пераможцы, пакуль адзін ня выказаўся цалкам і нешта не дагаворваецца, пакуль існуе таямніца... А калі нарэшце адзін прайграў, а другі не паказаў выгляду, што выйграў і пачаў тактоўна падтрымліваць слабейшага, тады ўзьнікае сям'я.

∘ ∘ ∘

Шмат хто сумняваецца і многія сьцьвярджаюць адваротнае, але прорву можна пераскочыць толькі за два скачкі, першы зь якіх мусіць зрабіць мужчына, а другі — жанчына.

∘ ∘ ∘

Кансьпірацыю распрацавалі жонкі, якія здраджвалі мужу.

## 6. Бацькі

∘ ∘ ∘

Мы хаваем бацькоў значна раней, чым яны паміраюць.

∘ ∘ ∘

Люблю Вавэнарга яшчэ й за тое, што ягоныя «Фрагмэнты» й «Афарызмы» чытаў і цытаваў мой бацька.

∘ ∘ ∘

Як пазьбегнуць найвялікшай страты — сьмерці маці? Пайсьці з жыцьця раней! Нашто было пытацца?

# IV. Бог — GOD

*Пра рэлігію*

## 1. Вера

∘ ∘ ∘

Неістотна, як ты патрапіў у сабор: праз чорны ход ці праз парадную браму, галоўнае — ты ў саборы.

∘ ∘ ∘

Самастойнасьць патрабуе ўпэўненасьці, а залежнасьць — веры.

∘ ∘ ∘

Той, хто верыць у тэхнічны прагрэс, павінен памятаць, што пры дапамозе сродкаў вытворчасьці, самых розных машын і мэханізмаў, адзін чалавек зрабіў з другога раба.

∘ ∘ ∘

Давер пераходзіць у залежнасьць.

∘ ∘ ∘

Асноўная загана тырана — вера ў сябе.

◦ ◦ ◦

Вера — гэта не суцяшэньне, а паводзіны, у якіх ёсьць месца й суцяшэньню.

◦ ◦ ◦

Шкадую, што ня маю поўнай веры. Нават сьмерць не пераконвае, а яшчэ больш раздражняе фантазію й спараджае сумневы.

◦ ◦ ◦

Як сяброўства зазвычай пачынаецца са сваркі, так і вера бярэ выток з блюзьнерства.

◦ ◦ ◦

Зьнявага чужых багоў не дадае веры ў свайго Бога.

◦ ◦ ◦

У манахаў, мусібыць, добры абутак, бо шлях да Бога доўгі й пакручасты. Ня варта мяне папракаць за іранічныя ноткі. Манахі — гэта людзі, што йдуць да Бога не праз вучэньне, а праз матэрыю. Манах — цялеснае ўвасабленьне веры.

○ ○ ○

Верыш, спадзяесься на Страшны суд — і ўсё дзеля таго, каб на імгненьне ўваскрэснуць.

○ ○ ○

Грэшнікі зьбіраюцца ў царкве. Ня верыш? Учыні кепскае, прызнайся, і табе абавязкова параяць наведаць царкву...

○ ○ ○

Вера ў Бога неразумных шукае апірышча ў заганным жаданьні быць лепшымі за іншых, хоць дастаткова быць іншымі.

○ ○ ○

Ты баісься адзіноты прыблізна так, як і сьмерці. Твая вера ў жыцьцё пасьля сьмерці нагадвае спадзяваньні літаратара, які думае, што ягоныя творы калі-небудзь дый прачытаюцца.

○ ○ ○

Калі паверыш у няспыннасьць зьменаў, давядзецца прыняць і памылковасьць любога выніку, бо ён ня зможа быць канчатковым.

## 2. Рэлігія

○ ○ ○

Недаацэньваць сэктар рэлігіі нельга. Змагар з адной канфэсіяй абавязкова патрапіць у лягер іншай. Так хрысьціяне змагаюцца зь юдэямі, юдэі — з мусульманамі, мусульмане — з хрысьціянамі... Атэізм — таксама адна з формаў рэлігійнай думкі, пабудаванай на доказах ад процілеглага.

○ ○ ○

Хто скажа, што першаснае: рэлігія ці атэізм?

○ ○ ○

Прызнаць існаваньне разумнейшага за сябе цалкам нармальна. А вось падпарадкоўвацца разумнейшаму, ня ведаючы яго, — глупства несусьветнае. Большасьць вернікаў якраз і падпарадкоўваецца, толькі не разумнейшаму, а — хітрэйшаму, і ня Богу, а — папу.

○ ○ ○

Каб разьвеяць маркоту, учыняюць шмат грахоў, а галоўны зь іх — занатоўваньне рэвалюцыйных ды атэістычных думак.

∘ ∘ ∘

Блюзьнерства — салодкім голасам сьвятара нашэптваць пра пекла.

∘ ∘ ∘

Каму ня трэба саступаць, дык гэта царкоўнікам і жанчынам. А ты ўвесь час саступаеш, асабліва апошнім. Сьцеражыся, бо ўсё больш і больш трапляюцца на шляху царкоўнікі і жанчыны ў адной асобе.

## 3. Бог

∘ ∘ ∘

Не кажы прылюдна, што табе кепска, нясьцерпна, гнюсна... Толькі Ўсявышні ведае, як можа быць горка.

∘ ∘ ∘

Жах перад зьзяньнем Бога — пачатак мудрасьці, страх перад д'яблам — пачатак разбурэньня, вар'яцтва й гвалту.

∘ ∘ ∘

Саборы — амбасады Бога.

∘ ∘ ∘

Сьнедаў і мерыў тэмпэратуру. Ці не захварэў?

У чалавека норма вядомая — 36,6 °С. У д'ябла яна, напэўна, іншая, можна дапусьціць, што — 66,6 °С (бо лічба ягоная — 666). Калі пабудаваць простую сымэтрыю, паставіўшы чалавека паміж дабром і злом, дык тэмпэратура Бога наблізіцца да 0 і будзе 6,6° паводле Цэльсія...

Пасьнедаўшы, я зазначыў на градусьніку норму — 36,6 °С.

Значыць, ізноў лёгкая прастуда й пера-томленасьць.

o o o

Заўважыў, што большасьць вернікаў думаюць пра Бога як пра вялікага кіраўніка, які можа выпісаць ордэр на жылплошчу ў Раі. О, каб жа так і было насамрэч!

o o o

«Бойся Бога!» — гаворыць і той, хто пажадаў уладарыць над табою.

o o o

Цяжка ўявіць, як абрыдлі Богу людзі са сваімі просьбамі.

o o o

З д’яблам можна пагаварыць, паспрачацца, пажартаваць... Перад Богам варта маўчаць і слухаць.

o o o

Пішу «Бог« зь вялікай літары яшчэ й таму, што вельмі люблю вялікія літары.

∘ ∘ ∘

Чалавек, які сядзіць на валізе, заўсёды нагадвае мне пра Хрыста ў пустэльні.

∘ ∘ ∘

Бог — гэта прадчуваньне катастрофы.

∘ ∘ ∘

У мінорныя хвіліны пачынае здавацца, што сустрэча з д'яблам — такая ж недасягальная рэч, як і сустрэча з Богам.

∘ ∘ ∘

Той, хто выказвае нянавісьць да Бога, не абавязкова атрымае д'яблавы ўзнагароды.

∘ ∘ ∘

Развагі пра Бога — гэта, збольшага, размовы пра ідэальны парадак.

∘ ∘ ∘

Калі адчуеш уласную разумовую абмежаванасьць, ведай: няма іншага выйсьця, апрача як вызначыць канфэсійную прыналежнасьць продкаў, прыйсьці ў храм і зьвярнуцца да Бога.

° ° °

Бог, прырода, лёс — занадта часта ўжываюцца як сынонімы, а насамрэч такімі не зьяўляюцца.

° ° °

Наколькі лёгка здрадзіць, настолькі ж цяжка дараваць здраду, калі наогул магчыма яе дараваць, бо ўсё часьцей пераконваюся, што прэрагатыва дараваньня належыць Богу.

° ° °

Сутыкнуўшыся з тэкстамі Лятрэамона, можна падумаць: чалавек спазнаў усемагутнасьць Усявышняга дзеля таго, каб абвінавацiць Бога ў насланьні бядотаў, катастрофаў, стыхіяў і паморкаў.

° ° °

«Мы ня маем права задаваць Творцу ніякіх пытаньняў». Сьціпла сьцьвярджае Лятрэамон, нібыта ніколі й не паўставаў супраць Усявышняга. І ўсё ж у гэтым сказе тоіцца ненатольная прага задаць Богу пытаньне. Хоць бы адно. Напрыклад, я запытаўся б у Творцы: «Нашто?»

○ ○ ○

Шмат разоў задаваў сабе адно й тое ж пытаньне... Чаму люблю прагулянкі па могілках? Пакуль не прачытаў у Альбэрта Савініа, што Эўропа — гэта магіла Бога.

○ ○ ○

Вы сьмяротныя. Нашто вам думаць пра багоў?.. Пытаецца ўзрушаны кінік Дэманакт. А я і думаю пра сьмяротнасьць багоў.

○ ○ ○

Быку падабаецца бык, аслу — асёл, сьвіньні — сьвіньня... Чуеш у Эпіхарма. Можа, таму, спрабуючы ўявіць Бога, ты малюеш чалавека? А можа, Бог, ведаючы абмежаванасьць і слабасьці твае, зьяўляўся ў вобразе любімым і зразумелым? Нашто Ўсемагутны патурае слабому? Адкажа паэт Эпіхарм... Быку падабаецца бык!

○ ○ ○

Заўважаеш — узьненавідзеў сьвет: гэта — блага, тут — кепска, паўсюль цёмна, людзі — ворагі, няздары, пачвары. Жывеш бязмэтна. Сьцюдзёныя проймы сьвішчуць паміж брудных будынкаў, шархацяць пакамечанымі газэтамі. Пад чаравікамі плюхае рас-

кіслы сьнег. Насустрач сунецца чырванапысае стварэньне зь сінім носам ды сьлязьлівымі вочкамі. Дзякуй табе, Божа, што ня даў мне такога твару! — думаеш ты. Вось і палёгка.

## 4. Павер'і

∘ ∘ ∘

У старажытных беларусаў існавала павер'е, што трэба палюбіцца са сваёй жонкай на вясновым засеяным полі, каб Бог даў добры ўраджай. Вельмі часта жанчына раскідала мужчынскае семя па палетку і пры гэтым прыгаворвала: «Божа! Урадзі мой хлеб! Выйдзі колас зь зямлі высокі й прыгожы!»

∘ ∘ ∘

Чуткі — найкаштоўнейшы матэрыял, зь якога ўтвараюцца міты.

∘ ∘ ∘

У мроях лунае зародак хімэры.

∘ ∘ ∘

Юда — найвыдатнейшы драматычны актор у хрысьціянскім сьвеце.

∘ ∘ ∘

Прывіды нараджаюцца ў люстэрках.

∘ ∘ ∘

Можна не сумнявацца, што электрычнасьць і сродкі масавай інфармацыі вынайшаў д'ябал.

∘ ∘ ∘

Падтрымка прыходзіць да таго, хто яе заслужыў; на такіх сафізмах і будуюцца ўлада, прыгнёт і рабства.

∘ ∘ ∘

Канфуцый раіў шанаваць дэманаў і духаў, але не заклікаў набліжацца да іх. Толькі дэманы й духі, пабачыўшы пашану, самі могуць наблізіцца, каб выказаць хоць бы і ўдзячнасьць.

∘ ∘ ∘

На руінах імпэрыяў скачуць міталягічныя героі.

## 5. Падман

∘ ∘ ∘

Найгоршы вораг — той, хто цябе прыніжае.

∘ ∘ ∘

Ілжывы чалавек імкнецца кампэнсаваць уласную лісьлівасьць і прыніжанасьць квяцістай ироніяй і пыхлівай фанабэрыяй.

∘ ∘ ∘

Заўсёды думаў, што гандаль — мастацтва падманваць. У Вавэнарга больш ёміста... Гандаль — школа падману. Не навука, не мастацтва, а менавіта школа.

∘ ∘ ∘

Мастацтва падабацца — гэта ўменьне падманваць. Так-так, спадар Вавэнарг. Гэта, бясспрэчна, першы ўрок у школе падману, якая завецца гандлем.

o o o

Безгустоўнасьць вынікае з хлусьні.

o o o

Калі ўспрымаеш падман як уласную няспраўджаную надзею, робіцца лягчэй.

o o o

Самыя непатрэбныя рэчы ў кватэры — падарункі.

o o o

Ашуканца пазнаеш па сур'ёзным твары.

o o o

Гэта хлусьня, што можна карыстацца чужымі поглядамі.

o o o

Хітрасьць — кволая форма падману.

o o o

Хлусьня — вось мова, зразумелая ўсім народам, на ўсіх нарадах і ва ўсе часы.

∘ ∘ ∘

Калі ашукваеш дарослага, перажываеш менш, чым падмануўшы дзіця, бо да дзіцяці ставісься досыць сумленна, амаль як да самога сябе. Падманутага заўсёды шкада.

## 6. Сорам

∘ ∘ ∘

У сораму колер ружовы, а ў спалоху — белы.

∘ ∘ ∘

Сорам — тое зерне, зь якога можа вырасьці абурэньне; тады замест ружовага ўбачыш пунсовы твар, і ня дай Бог прысутнічаць пры гэтым пераўтварэньні і бачыць вочы ворага, налітыя крывёю.

∘ ∘ ∘

Сорам — вонкавая, несьвядомая праява сумленнасьці.

∘ ∘ ∘

Ня варта й спадзявацца, што ніхто ня ўбачыць, як за нетактоўнасьцю ты хаваеш сорам.

∘ ∘ ∘

Каб спыніць баязьліўца, часам дастаткова спытацца: «Дзе твой сорам?»

## 7. Жыцьцё

∘ ∘ ∘

Шмат сваіх апавяданьняў я напісаў дзякуючы фотакарткам: углядаўся ў твары людзей, якіх даўным-даўно нямашака на белым сьвеце; яны ажывалі й ціха расказвалі пра свае лёсы, а я запісваў.

∘ ∘ ∘

Разглядаеш свае здымкі дый думаеш... Вось памру, і паляціце вы ўсе ў сьметніцу, ой паляціце.

∘ ∘ ∘

Жыцьцё — аднаразовы шпрыц.

∘ ∘ ∘

Пабытовыя дробязі ствараюць вялікія жыцьцёвыя праблемы.

∘ ∘ ∘

Нікога не чапаеш, каб толькі не краналі цябе. Не атрымліваецца. Лезуць і лезуць, нібыта хочуць табе дапамагчы жыць.

## 8. Сьмерць

○ ○ ○

Першапрычына сьмерці — нараджэньне.

○ ○ ○

За сьмяротнае пакараньне галасуюць баязьліўцы, а такіх у грамадзтве большасьць. Таму сьмяротную кару трэба адмяняць валявым рашэньнем — такім, як вяршыцца суд.

○ ○ ○

Адмяніць сьмяротнае пакараньне значна лягчэй, чым забараніць права асобы на самагубства.

○ ○ ○

Воблака — форма, у якую варта ўвасобіцца пасьля сьмерці.

○ ○ ○

Якое несусьветнае глупства гавораць і пішуць пра цябе пры жыцьці, а якую бязглузьдзіцу навярзуць пасьля сьмерці! Дык ці варта задумвацца пра пасьмяротны лёс?

∘ ∘ ∘

Шлях у царства мёртвых аднолькава кароткі зь любой кропкі зямлі.

∘ ∘ ∘

Сьмерць любіць праехацца на машыне «хуткай дапамогі».

∘ ∘ ∘

Калі ў халасьцяка памірае маці, ён робіцца ўдаўцом.

∘ ∘ ∘

Сьмерць, як лекар, ходзіць у белым халаце.

∘ ∘ ∘

Могілкі — склад старых макінтошаў.

∘ ∘ ∘

Не шчыруй за жалобным сталом.

∘ ∘ ∘

Не спадзявайся, што ведаеш, па якой сьцежцы да цябе прыйдзе сьмерць.

° ° °

Не давярай тым, хто зь лёгкім сэрцам разважае пра сьмерць.

° ° °

Паводзіць сябе так, нібыта ты несьмяротны — такое ж глупства, як панікаваць ад думкі пра немінучы скон.

° ° °

Паміж радзільняю й могілкамі няма аніякай розьніцы, гавораць самагубцы.

° ° °

Апісаньні сьмерці збольшага наіўныя, як апісаньні несьмяротнасьці й бясконцасьці.

° ° °

Нябожчыкаў трэба выкідаць хутчэй, чым гной... Гаворыць Геракліт. Пярэчыць ня варта. Трэба апекавацца ўласным целам ня толькі пры жыцьці, але й пасьля яго. Варта ўслухацца ў беларускае параўнаньне — прыгожы, як труна.

○ ○ ○

Адважыцца на самагубства можа самы здаровы і вясёлы чалавек, калі цяжар пакутаў або немінучая бяда пераважаць жах сьмерці... Убачыш у Шапэнгаўэра, і ўзьнікае пытаньне. Ці зможаш ты адолець жах сьмерці? Вядома! Раней ці пазьней, а ўсе там будзем.

○ ○ ○

Выбачай, а ты ніколі не заўважаў, што ў прозьвішчы «Шапэнгаўэр» хаваецца «Шапэн»?

○ ○ ○

Да сьмерці бацькоў не падрыхтуесься.

○ ○ ○

Nil admirari — анічому не зьдзіўляйся! Вось лёзунг, пад якім лёгка паміраць.

○ ○ ○

Дзень, калі прачытаў кнігу, лепшы за дзень, калі пачаў чытаць кнігу. Так і дзень сьмерці лепшы за дзень нараджэньня.

∘ ∘ ∘

Развагі пра сьмерць хвалююць ня меней за размовы пра эротыку.

∘ ∘ ∘

Жаданьне дакрануцца да сьмерці — надзвычай вялікае, яно нагадвае намер дзіцяці лізнуць намерзлы на лютым марозе бліскучы мэтал дзьвярное ручкі.

## 9. Душа

∘ ∘ ∘

Назіраючы за паляўнічым, якога папрасілі застрэліць хворага на лішай сабаку, я ўбачыў, як ягоная душа вылецела разам з куляю і, уварваўшыся ў голаў прывязанага да плоту цюціка, разьнесла яе. Потым шмат разоў даводзілася чуць пра тое, што душа забойцы ляціць да ахвяры разам з куляю. Але ва ўсіх тэкстах не ставала паэзіі, яны чыталіся й прачытваліся, як танная містычная бэлетрыстыка. Іншая рэч — абзац з Вавэнарга... Вось перад вамі душа рыбака: яна нібыта адлучылася ад цела і перасьледуе рыбу пад вадой. Падштурхоўвае яе да сеткі, заціснутай у ягонай руцэ. Ці магчыма паверыць, што гэтая душа заходзіцца ад радасьці, убачыўшы параду няшчаснай рыбіны, і трыюмфуе, апынуўшыся ў сетцы! Але ж менавіта так яно й адбываецца.

∘ ∘ ∘

Робіцца сьмешна, калі чуеш: «Не хапае душы!» Яна непадзельная, яна або прысутнічае, або адсутнічае. Не ставаць можа розуму.

° ° °

Вочы — люстэрка душы... Насі чорныя акуляры, каб злы дух не зазірнуў у душу.

° ° °

Пад час пазяханьня трэба прыкрываць рот, каб не ўцякла душа.

° ° °

Паверыць у несьмяротнасьць душы гэтаксама цяжка, як прызнаць у сябе сьмяротную хваробу.

## 10. Заганы

∘ ∘ ∘

У бездапаможных літаратараў зазвычай ёсьць адна яскравая рыса: яны — таленавітыя зайздросьнікі.

∘ ∘ ∘

У адрозьненьне ад спагады ці спачуваньня, зайздрасьць — заўсёды дзейсная. Ведаючы гэта, скіроўвай яе на стваральную працу, а не на руйнаваньне таго, што гэтую зайздрасьць спарадзіла. Пазайздросьці і — пераўзыдзі.

∘ ∘ ∘

Калі што і прыносіць выгоды, дык гэта несправядлівасьць. Яна адмаўляе роўнасьць. Дзякуючы ёй, у адных — усё, а ў другіх — нічога.

∘ ∘ ∘

Калі палітыкі пачынаюць гаварыць шчыра, я нічога ня чую, апрача бруднай лаянкі. І гэта не асаблівасьці майго вуха, а якасьці іхных языкоў.

ᴑ ᴑ ᴑ

У народу і ў паноў усё рознае — і дабрачыннасьці, і заганы. Заўважыў Вавэнарг. Можна працягнуць думку. Няма двух людзей, чые добрыя й злыя ўчынкі цалкам супадуць.

ᴑ ᴑ ᴑ

Сквапны спадзяецца на доўгае жыцьцё, чым і выклікае цікавасьць. Сквапнасьць — адна з формаў надзеі. Яе варта ўважліва дасьледаваць. Каб ня спудзіць сквапнага, варта за вочы называць яго ашчадным і мудрым, што недалёка ад праўды.

ᴑ ᴑ ᴑ

Кіданьне каменя ў птушку — праява зайздрасьці да здольнасьці лётаць. Але, калі надышоў час раскідаць камяні, ці ня лепей кідаць іх у птушак.

ᴑ ᴑ ᴑ

Самы жахлівы й небясьпечны сьведка тваёй бессаромнасьці й тваіх грахоў — ты сам. І як цяжка прымусіць гэткага сьведку маўчаць. А можа, самагубства — гэта зьнішчэньне галоўнага сьведкі грэхападзеньня? Пэўна. І таму хрысьціянская царква не прымае самагубцаў

і культывуе вобраз Юды, які, прадаўшы Хрыста, засіліўся.

° ° °

Грахі — учынкі, якія прыемна згадваць.

° ° °

Злодзей перш-наперш абкрадае сябе.

° ° °

Адзіны, каму варта даравацъ сьмяротныя грахі, — ты сам.

° ° °

Геніяльныя людзі — геніяльныя грэшнікі.

° ° °

Каб чалавек не ленаваўся, ён даўным-даўно зьнішчыў бы сябе.

° ° °

Тры ганебныя слупы сучаснага чалавецтва: энэрганосьбіты, сродкі камунікацыяў і вынікі дэмакратычных выбараў.

○ ○ ○

Дэмакратычныя выбары зьнішчаюць герояў лепей за тэрарыстаў і спэцслужбы.

○ ○ ○

Калі і паставіць сумленных над несумленнымі, дык народ прыйдзе да пакоры... Так казаў Канфуцый, калі ў яго пыталіся, як прывесьці народ да паслухмянасьці. Але бяда, што ня кожны сумленны чалавек, узвысіўшыся, застанецца сумленным. У момант узвышэньня большасьць людзей якраз і страчвае сумленьне.

○ ○ ○

Пра тое, што нельга браць чужое, ведаеш зь дзяцінства. Але чаму ж цябе не вучылі шукаць толькі сваё месца і ня ставіць сябе на чужое?

○ ○ ○

Зайздрасьць параўноўваюць з жабаю, якая сядзіць на грудзях, цісьне, не дае дыхаць, не дае жыць. Таму сьмяротныя грахі параўноўвай з га́дамі.

° ° °

Выпадак раскрывае ў табе як лепшае, так і горшае, але горшае праяўляецца лепш.

° ° °

І безнадзейны баязьлівец можа атрымаць мэдаль за адвагу.

° ° °

Лепей займець яскравую загану, чым пялегаваць чэзлую прыстойнасьць.

° ° °

Калі пачынаеш прыніжацца перад тыранам, яшчэ раз даказваеш сваю непамерную пыхлівасьць.

° ° °

Ёсьць індывіды, што знаходзяць задавальненьне, назіраючы за пакутамі іншых; таму кармленьне ўдава трусамі зьбірае ў зьвярынцы шмат гледачоў.

° ° °

Натоўп на стадыёне ўстае, калі бачыць падзеньне чалавека.

° ° °

Можаш і не заўважыць, як абедзенны стол зойме ў тваёй сьвядомасьці месца алтара.

° ° °

Абставіны мацней за чалавека!.. Такімі словамі ка́ты апраўдваюць злачынствы.

° ° °

Лайдак заўсёды сьпяшаецца, бо ведае, што спозьніцца.

° ° °

Звычайна дапамагаеш толькі таму, што сам спадзяесься на дапамогу.

° ° °

Вакол вар'ята жывуць адныя вар'яты. Прынамсі ён так сьцьвярджае.

° ° °

Хвалячы іншых, міжвольна ўсхваляеш сябе, і гэта лёгка адсочваецца.

∘ ∘ ∘

Калі нікчэмны чалавек губляе страх, ён робіцца бандытам, бо ў нікчэмных людзей няма сумленьня.

∘ ∘ ∘

Найтаньнейшы гатунак гонару — нацыянальны... Чытаеш у Шапэнгаўэра. І можна верыць, калі ў яго ж не чытаць наступнае... Немцы свабодныя ад нацыянальнага гонару і гэтым даказваюць сваю ўласную сумленнасьць.

∘ ∘ ∘

Ты любіш павагу да сябе толькі за перавагу, якую яна дае над іншымі, за жывёльную вагу.

## 11. Дабро

ο ο ο

У нас няма ні сілы, ні нагоды зьдзейсьніць усё добрае й злое, што мы меліся зрабіць. У гэтай максыме Вавэнаргу не стае кроплі аптымізму. І дзякуй лёсу. Бо ўжо панішчылі б адзін аднаго з самымі добрымі намерамі ў сэрцы.

ο ο ο

Добрага заўсёды замала, а злога — зашмат. І чаму ўсе спадзяюцца на казачны фінал, дзе дабро перамагае зло?

ο ο ο

За дабро варта сплочваць, а за зробленае табе зло можна й не плаціць.

ο ο ο

Дабрыня першая сыходзіць зь вялікай і заможнай імпэрыі.

○ ○ ○

Колькасьць крыві ў чалавека абмежаваная, а прага быць свабодным — не.

○ ○ ○

Свабоды баіцца раб.

○ ○ ○

Добрых уладароў не існуе.

○ ○ ○

Тыранія нараджае змагароў, барацьбу, супраціў і нарэшце — водар свабоды.

○ ○ ○

Сацыяльная роўнасьць — ня ў тым, што ўсе аднолькава вольныя, а ў тым — што аднолькава прыніжаныя.

○ ○ ○

Найкарацейшы шлях да ўлады ляжыць праз дабрыню. Але быць добрым цяжэй, чым выкарыстоўваць сілу.

◦ ◦ ◦

Чалавечнасьць — гэта прастата.

◦ ◦ ◦

Лёгка даравацъ толькі тое, што ня крыўдзіць асабіста цябе.

◦ ◦ ◦

Ветлівасьць — навука суіснаваньня.

## 12. Варожасьць

∘ ∘ ∘

Як намерысься дыскрэдытаваць ворага ў вачах грамадзтва, канстатуй сэксуальную ненармальнасьць абранай пэрсоны, кажы: «Спадар X. Y. любіць паразважаць пра геніталіі ды ўрынатэрапію».

∘ ∘ ∘

У часе скрухі можна суцешыць сябе думкаю: ты робіш столькі зла, колькі ворагі робяць табе. Суцяшэньня варта шукаць у раўнавазе.

∘ ∘ ∘

Вораг — пераапрануты сябра.

∘ ∘ ∘

Калі за зло плаціць злом, а за дабро сплочваць дабром, можна незаўважна ператварыцца ў люстэрка, дзе ня знойдзецца месца ні спачуваньню, ні чалавечнасьці. Можа, таму Канфуцый заўважае: за зло трэба сплочваць у згодзе з тваім сумленьнем.

∘ ∘ ∘

Калі нейкі чалавек беспадстаўна ненавідзіць цябе, і ты ў гэтым неаднаразова ўпэўніваўся, зрабі яму зло, каб нарэшце знайшоўся трывалы грунт для нянавісьці.

∘ ∘ ∘

У забойцы амаль заўсёды напагатове адвакат, а ў ахвяры яго чамусьці няма.

∘ ∘ ∘

Услаўляюцца зазвычай рэчы нікчэмныя.

∘ ∘ ∘

Самы дасканалы данос можна напісаць толькі на самога сябе, а мець з гэтага будуць усё адно інквізытары.

∘ ∘ ∘

Вялікая бяда вылупліваецца з маленечкага няшчасьця, як зьмяя зь яйка.

∘ ∘ ∘

Змагацца супраць зла — значыцца, занадта яго ганараваць... Чытаю ў Лятрэамона. Зразумела, шанаваць зло ня варта, змагацца

зь ім цяжка. Але яго нельга праігнараваць. Зло актыўнае, дынамічнае, агрэсіўнае. І найлепшы стан, у якім можа быць зло — гэта сон. Пакуль зло сьпіць, можна пасьпець заняць пазыцыю недасяжнасьці для пэўнага зла. Хай пачвара прачнецца й пабачыць насупраць сябе гэткую ж злую галодную пачвару. Хай счэпяцца ў двубоі два кракадзілы. Будзе на што паглядзець, пры ўмове, што сам ты — не кракадзіл.

∘ ∘ ∘

Калі перастаеш злавацца, робісься добрым... Запэўнівае Лярашфуко. Зусім не абавязкова, можаш стаць і абыякавым.

## 13. Сяброўства

○ ○ ○

Посьпех аддаляе знаёмых, адпрэчвае ворагаў і пазбаўляе сяброў.

○ ○ ○

Нязмушаная размова зь сябрам — найлепшая школа для розуму... Нельга не пагадзіцца з мэтрам Вавэнаргам.

○ ○ ○

Каб сябраваць, трэба пакінуць заганную звычку патрабаваць ад сяброў такіх ахвяраў, якія ты сам прыносіш на алтар дружбы. Кожны ахвярує, колькі можа, і сябрує, як умее.

○ ○ ○

Выдатна прыбраны, сытны, поўны тонкіх напояў стол лепей за грошы мацуе сяброўства... Не стамляюся паўтараць.

∘ ∘ ∘

Ня варта сварыцца зь сябрамі й знаёмымі; яны самі пакінуць цябе, як толькі даведаюцца й пабачаць, што на тваім полі ўсё добра.

∘ ∘ ∘

Некалькі разоў зьбіраўся скласьці сьпіс былых сяброў, зь якімі ня трэба вітацца. Справа адкладалася праз тое, што ніводнага зь іх не хацелася запісваць першым.

∘ ∘ ∘

Ёсьць такі жарт: грошы — найлепшыя сябры. Меркаваньне небеспадстаўнае: менавіта за грошы і прадаецца сяброўства, прадаецца, але не набываецца. У Беларусі яшчэ кажуць: грошы сяброў разводзяць.

∘ ∘ ∘

Добра мець у сябрах: чалавека разумнага, каб было з кім параіцца; чалавека абазнанага ў мэдыцыне, каб дапамагаў пад час хваробы; і чалавека шчодрага, які ад шчырага сэрца робіць падарункі.

° ° °

Легкадумны чалавек прасьцей простага завязвае сяброўства і лягчэй лёгкага разьвітваецца зь сябрам, а таму марны занятак — пошукі глыбокіх узаемінаў зь неглыбокімі людзьмі.

° ° °

Сябры заводзяцца проста, як каты й сабакі, — захацеў і завёў; галоўнае, каб было чым карміць і паіць.

° ° °

Не спрабуй лекаваць сябра ад зайздрасьці, пагадзіся з думкаю, што сябра няма.

° ° °

Найлепшы сябра любіць сябе болей, чым цябе.

° ° °

Сяброўства — гэта адсутнасьць патрабаваньняў.

° ° °

Не сябруй з тымі, хто табе ня роўны, і ня бойся выпраўляць уласныя памылкі... Чуеш

параду Канфуцыя. Колькі разоў і я мусіў разрываць дачыненьні з добра знаёмымі людзьмі.

Складана сказаць праўду пра тое, што ня будзеш сябраваць.

«Калі ласка, не турбуй мяне й маю сям'ю», — словы простыя, а вымавіць іх цяжка.

∘ ∘ ∘

Сяброўства — перадусім шчырасьць.

∘ ∘ ∘

Калі твае сябры сышлі з абранага разам шляху, калі здрадзілі агульным ідэалам, якая тады розьніца — жывуць яны, ці іх няма на сьвеце?

∘ ∘ ∘

З былымі сябрамі пазьбягай сустрэчаў, а пры выпадковых сутыкненьнях не вітайся, нават калі яны першыя пададуць руку.

∘ ∘ ∘

Не кажы пра сяброў кепскае — гэта, найхутчэй, праўда.

○ ○ ○

Аднавіць страчанае сяброўства немагчыма: яно, як хваля аб скалу, разьбіваецца на дробныя пырскі аб зайздрасьць.

○ ○ ○

Сабака-жывёла брэша на злодзеяў і кусае ворагаў, а сабака-філёзаф кідаецца й выскаляецца на сяброў і суайчыньнікаў дзеля выратаваньня іх душаў.

○ ○ ○

«О сябры мае, няма болей ніводнага сябра!» — любіў паўтараць Арыстотэль. Такое можна вымавіць толькі ў пэўным узросьце; асабіста я паўтарыў Арыстотэлеву думку ў 37 гадоў.

○ ○ ○

Сапраўднае сяброўства прыдумалі ў XVII стагодзьдзі маралісты кшталту Ляраштфуко.

○ ○ ○

Сяброўства ўмацоўваюць не прызнаньні ў любові й павазе, а разгадваньне патаемных учынкаў, якія сябра намерваўся схаваць ад цябе.

° ° °

Два разы пачынаць сяброўства з адным чалавекам — глупства. Але, па тваіх асабістых назіраньнях, робіцца гэта менавіта два разы. Каб пераканацца ў непатрэбнасьці вашага сяброўства, адной сваркі зь сябрам недастаткова.

° ° °

З большасьцю знаёмых ты перастаў бы вітацца, каб толькі пачуў, што яны гавораць пра цябе за вочы. Ды каб яны даведаліся, што ты пра іх думаеш. Што зробіш... Патаемныя словы й думкі — найцікавейшыя.

## 14. Старасьць

∘ ∘ ∘

Мудрасьць і свабода несумяшчальныя са слабасьцю... Гаворыць Вавэнарг. А што рабіць са старымі мудрацамі і дзецьмі? Яны ж самыя нязмушаныя, найбольш свабодныя ў выказваньнях і паводзінах. Дый наогул, мудры — гэта абазнаны ў жыцьці і, адпаведна, пажылы чалавек.

∘ ∘ ∘

Ня трэба чакаць вялікіх паслуг ад старых людзей... Запэўнівае Вавэнарг. Пагаджаюся. На старых нельга ўскладаць спадзяваньняў, зьвязаных з доўгатэрміновымі пэрспэктывамі, але спакойна выслухоўваць іх крытычныя заўвагі адносна дня сёньняшняга варта заўсёды. Крытыка цьверазіць.

∘ ∘ ∘

Парады старых людзей — нібыта зімовае сонца: сьвецяць, але ня грэюць... Маркоціцца Вавэнарг. Дарэмна. Парада і не павінна саграваць. Яна — не жанчына. Парада больш падобная да промня, які асьвятляе шлях.

○ ○ ○

Калі на схіле гадоў мы страчваем таленты й прыгажосьць, замяніць іх могуць, дый тое зь цяжкасьцю, толькі добрае імя й багацьце... Спадзяваўся Вавэнарг. Вядома, хацелася б даць веры. Але мой саракагадовы досьвед падказвае, што спадзяваньні Вавэнарга дарэмныя, хоць і не пазбаўленыя практычнасьці, асабліва ў пункце пра багацьце.

○ ○ ○

І на схіле гадоў не зашкодзяць доўгатэрміновыя пляны. Паміраць зьбірайся, а жыта сей... Паўтарае мой бацька.

○ ○ ○

Спачатку перажываеш, што ты яшчэ не дарослы, потым — што ня самы прыгожы, пазьней — што небагаты, напрыканцы — што нешчасьлівы, хворы й стары. А перажываць і ня варта.

○ ○ ○

Пад час гаворкі са старымі людзьмі не забывай пра іхнае жаданьне надаваць значнасьці мінулым падзеям, якія амаль не ўплываюць на дзень сёньняшні.

ο ο ο

Ні разу не апранутая кашуля хутка зношваецца.

## 15. Шчасьце

○ ○ ○

Больш чым дастаткова быць шчасьлівым самому па сабе. Тым больш, што і няшчасны — заўсёды ў адзіноце.

○ ○ ○

Сьвядомы сыход у цень — адзін з найкарацейшых шляхоў да радасьці.

○ ○ ○

У мужчын на душы сьвята, калі яны трымаюць у руках конаўкі, дзе гарыць сьпірт.

○ ○ ○

У жанчын на душы сьвята, калі яны глядзяць на новыя фотакарткі сваіх дзяцей.

○ ○ ○

У хлапчука сьвята, калі яму першы раз дазволілі самому запаліць запалку.

∘ ∘ ∘

У дзяўчынкі сьвята, калі яна фатаграфуецца побач зь нявестай.

∘ ∘ ∘

Радасьць — усьмешка, а ня рогат.

∘ ∘ ∘

Шчасьце — калі можаш ціха ляжаць і думаць пра сьмерць.

# 16. Ідэалы

∘ ∘ ∘

Нашто сто адзінаццаты раз даводзіць тое, што ў масавай сьвядомасьці зьяўляецца бясспрэчнай ісьцінай? Масавыя ісьціны трэба абвяргаць.

∘ ∘ ∘

Ідэальная чысьціня патыхае хлёркаю.

∘ ∘ ∘

Сумленьне — шкадаваньне таго, што зрабіў і ня можаш вярнуць.

∘ ∘ ∘

Больш за ўсё на сьвеце мяне вабіць узор задавальненьняў, вытканы на кіліме жыцьця.

∘ ∘ ∘

Гонар больш каштоўны за славу... Сьцьвярджае Шамфор. І можна было б зь ім пагадзіцца, каб толькі займець першае і другое ў дастатковай колькасьці.

∘ ∘ ∘

Ня лепш было б людзям, каб спаўнялася ўсё, што яны пажадаюць... Заўважыў Геракліт. Сапраўды. Людзі, чые запаветныя жаданьні спраўдзіліся, нагадваюць інвалідаў-жабракоў.

∘ ∘ ∘

«Толькі няправільныя, павярхоўныя пытаньні маюць адказ, а правільныя, глыбінныя адказу не знаходзяць», — казаў Крышнамурці, які спытаў: «Як гучыць хлапок адной далоні?»

∘ ∘ ∘

Дзеля таго, каб вывучаць парадак, ня трэба вывучаць беспарадку... Упэўнены Лятрэамон. Досыць пераканаўчы пастулят. Толькі вялікі прыхільнік парадку — Леанарда да Вінчы — пераконваў у адваротным. На ягоную думку, спасьціжэньне й стварэньне прыгожага і ўпарадкаванага непасрэдным чынам зьнітаванае з дасьледаваньнем пачварнага, бруднага й хаатычнага. Мне бліжэй пазыцыя Леанарда. І ў якасьці доказу падам прыклад зь юнацтва майго бацькі. Ён вырашыў паплаваць у рэчцы пасьля навальніцы. Вада была высокая, плынь моцная. Вір пацягнуў яго на дно. Бацька што сілы супраціўляўся, але змогі ўсплыць на паверхню не ставала. Ён быў блізкі да страты

прытомнасьці і гібелі ў цёмнай вадзе. Толькі ў апошні момант узьнікла выратавальная здагадка — не супраціўляцца моцнаму віру, пайсьці на дно, а там адштурхнуцца ад цьвёрдага й выплысьці на паветра. Бацькава перамога над хаосам бруднай пасьлянавальнічнай вады пераконвае мяне ў неабходнасьці вывучэньня беспарадку дзеля стварэньня парадку.

∘ ∘ ∘

Найлепшы спосаб пераканальня — не пераконваць зусім... Як пасьля гэтых словаў не паціснуць руку празарліўцу Лятрэамону? У дасканаласьці ягонае думкі давялося пераконвацца неаднаразова — і ў размовах з палітыкамі, якія ў большасьці ня маюць сталых пераканальняў, і ў размовах з прадстаўнікамі праваахоўных органаў, у чыіх зрэнках утойваецца прага забойства.

∘ ∘ ∘

Сапраўднае задавальненьне немагчыма атрымаць без абмежаваньняў і запатрабаваньняў.

∘ ∘ ∘

Абмяжуй уласныя патрэбы й пазьбегнеш большасьці расчараваньняў, але тады не ат-

рымаеш і сапраўдных задавальненьняў. Выбірай.

∘ ∘ ∘

Знайшоўшы мэту жыцьця, пачынаеш пошук сродкаў дзеля яе ажыцьцяўленьня й неўзабаве разумееш: у ахвяру мэце трэба прынесьці ўласнае жыцьцё. А ці вартая мэта, хай сабе й найвышэйшая, таго, каб губляць жыцьцё? Пэўна ж, не. Лепей адмовіцца ад мэты жыцьця дзеля самога жыцьця. Так яно й здараецца.

# Паказальнік імёнаў

**Адысон (Addison) Джозэф** (1672—1719) — ангельскі літаратар, вучоны, журналіст і палітычны дзеяч.

**Арыстотэль** (384—322 да н. э.) — старажытнагрэцкі філёзаф і вучоны.

**Бэкан (Bacon) Фрэнсіс** (1561—1626) — ангельскі філёзаф.

**Вавэнарг (Vauvenargues) Люк дэ Клап'е дэ** (1715—1747) — францускі філёзаф, прадстаўнік эпохі Асьветы.

**Вальтэр (Voltaire)** (сапраўднае імя Франсуа Мары Аруэ [Arouet]) (1694—1778) — францускі філёзаф, пісьменьнік, гісторык, прадстаўнік эпохі Асьветы.

**Ван Гог (van Gogh) Вінцэнт** (1853—1890) — галяндзкі мастак.

**Вэгецый (Vegetius) Флавій Рэнат** (4—5 стагодзьдзі н. э.) — рымскі гісторык.

**Галіяф (Gŏljat)** — у Старым Запавеце асілак, якога забіў у двубоі Давід.

**Геракліт з Эфэсу** (544/540/535—483/480/475 да н. э.) — старажытнагрэцкі філёзаф.

**Давід** (**Dāvid** — магчыма, «любімы») — біблійны герой, які забіў Галіяфа.

**Дыяген Сынопскі** (каля 400 — каля 327 да н. э.) — старажытнагрэцкі філёзаф-кінік.

**Дэманакт** (1—2 стагодзьдзі н. э.) — старажытнагрэцкі філёзаф.

**Захер-Мазох (Sacher-Masoch) Леапольд фон** (1836—1895) — аўстрыйскі пісьменьнік.

**Кадук** — міталягічны герой беларускіх паданьняў.

**Камю (Camus) Альбэр** (1913—1960) — францускі філёзаф, публіцыст, пісьменьнік, драматург.

**Канфуцый (Кун-цзы)** (каля 551—479 да н. э.) — старажытнакітайскі мысьляр.

**Квінтыліян (Quintilianus)** (каля 35 — каля 96 н. э.) — рымскі красамоўца.

**Клаўдыян (Claudianus)** (каля 375 — пасьля 404 н. э.) — рымскі паэт.

**Крышнамурці Джыду** (нарадзіўся ў 1895 або ў 1897 — 1986) — індыйскі філёзаф і паэт.

**Леанарда да Вінчы (Leonardo da Vinci)** (1452—1519) — італійскі мастак, скульптар, інжынэр, архітэктар, вучоны, мысьляр.

**Людовік XIV** (1638—1715) — францускі кароль з 1643 году. Ягонае праўленьне — апагей абсалютызму.

**Лябруер (La Bruyere) Жан дэ** (1645—1696) — францускі пісьменьнік.

**Ляршфуко (La Rochefoucauld) Франсуа дэ** (1613—1680) — францускі пісьменьнік-мараліст.

**Лятрэамон (Lautréamont)** (сапраўднае імя Ізідор Дзюкас, (Ducasse)) (1846—1870) — францускі паэт.

**Ніцшэ (Nictzsche) Фрыдрых** (1844—1890) — нямецкі мысьляр.

**Нэсі** — мітычная істота, падобная да дыназаўра, якая нібыта жыла ў Лахнэскім возеры ў Англіі.

**Плятон** (427—347 да н. э.) — старажытнагрэцкі філёзаф і пісьменьнік. Вучань Сакрата.

**Расін (Racine) Жан** (1639—1699) — францускі драматург, прадстаўнік клясыцызму.

**Рафаэль Санці (Raffaello Santi)** (1483—1520) — італійскі мастак і архітэктар.

**Савініа (Savinio) Альбэрта** (1891—1952) — італійскі мысьляр, кампазытар, мастак і пісьменьнік.

**Сад (Sade) Данасьен-Альфонс-Франсуа дэ** (1740—1814) — францускі пісьменьнік.

**Сакрат** (470/469—399 да н. э.) — старажытнагрэцкі філёзаф.

**Скаварада Грыгорый Савіч** (1722—1794) — украінскі філёзаф, паэт, пэдагог.

**Тора (Thoreau) Генры Дэвід** (1817—1862) — амэрыканскі пісьменьнік і філёзаф.

**Фукс Эдуард** (1870—1940) — нямецкі вучоны, пісьменьнік і палітычны дзеяч.

**Фулер (Fuller) Томас** (1654—1734) — ангельскі мысьляр.

**Хрыстос Ісус** — богачалавек у хрысьціянскай міталёгіі.

**Чорны чалавек** — герой аднайменнай паэмы расейскага паэта Сяргея Ясеніна (1895—1925).

**Шамфор (Chamtort) Ніколас-Сэбасьцьен** (1741—1794) — францускі пісьменьнік.

**Шапэнгаўэр (Schopenhauer) Артур** (1788—1860) — нямецкі філёзаф-пэсыміст.

**Эзоп** (6 стагодзьдзе да н. э.) — паўлегендарны старажытнагрэцкі байкапісец.

**Эклезіяст** (грэцкае ekklēsiastēs, пераклад са

старажытнагабрэйскага gëhéleth — той, хто прапаведуе ў сходзе) — адна з найбольш позьніх кніжак Бібліі (4 ці 3 стагодзьдзе да нашай эры), помнік афарыстычнай літаратуры.

**Эпіхарм** (другая палова 6 — першая палова 5 стагодзьдзяў да н. э.) — старажытнагрэцкі драматург і філёзаф-піфагарэец.

**Эрот (Эрас)** — у грэцкай міталёгіі бог любові й каханьня, яму адпаведны рымскі Амур (Купідон).

**Юда** — у хрысьціянскай міталёгіі вучань Хрыста, здраднік.

# ЗЬМЕСТ

**І. ЖЭСТ — GESTURE**

*Пра творчасьць*

1. Культура ........................7
2. Творчасьць ........................8
3. Талент ........................9
4. Слава ........................14
5. Літаратура ........................17
6. Слова ........................26
7. Кніга ........................27
8. Мастацтва ........................33

**ІІ. НУЛЬ — ZERO**

*Пра навуку*

1. Розум ........................41
2. Цывілізацыі ........................46
3. Прырода ........................47
4. Чалавек ........................48
5. Асоба ........................52
6. Паводзіны ........................55
7. Веды ........................68
8. Здароўе ........................70
9. Вайна ........................71
10. Гвалт ........................76
11. Палітыка ........................81
12. Праца ........................83
13. Час ........................85
14. Грошы ........................89

## III. СЭКС — SEX

*Пра эротыку*

1. Каханьне ....................................101
2. Любоў ....................................108
3. Мужчына ....................................109
4. Жанчына ....................................110
5. Сям'я ....................................113
6. Бацькі ....................................114

## IV. БОГ — GOD

*Пра рэлігію*

1. Вера ....................................117
2. Рэлігія ....................................120
3. Бог ....................................122
4. Павер'і ....................................128
5. Падман ....................................130
6. Сорам ....................................133
7. Жыцьцё ....................................134
8. Сьмерць ....................................135
9. Душа ....................................140
10. Заганы ....................................142
11. Дабро ....................................149
12. Варожасьць ....................................152
13. Сяброўства ....................................155
14. Старасьць ....................................161
15. Шчасьце ....................................164
16. Ідэалы ....................................166

*ПАКАЗАЛЬНІК ІМЁНАЎ* ....................*170*

Друкарня АТ ,,VILSPA", Вільня, Літва



Адам Глёбус

Аўтапартрэт. 1977

Кнігі Адама Глёбуса:

1. Парк. Вершы. Мінск. "Мастацкая літаратура". 1988

2. Адзінота на стадыёне. Апавяданні. Мінск. "Мастацкая літаратура". 1989

3. Оборотни. Эротическая проза. Минск. "БАДППР". 1991

4. Смерць-мужчына. Проза. Мінск. "Беларускі Дом друку". 1992

5. Скрыжаваньне. Вершы. Менск." БАДППР", " Ковчег". 1993

6. Дамавікамэрон. Проза. Менск. "BADPPR". 1994

7. Толькі не гавары маёй маме. Зборнік інтымнае прозы. Менск. "Сучасная літаратура".1995

8. Койданава. Проза. Менск. "Літаратура". 1997

9. Demonokameron. Białystok."ZBRP".1998

10. Новы дамавікамэрон. Казкі для дарослых. Менск. "Літаратура". 1998

0

POST SCRIPTUM

АДАМ ГЛЁБУС